№ 3(57)/2006

# Беларускія Ведамасьці

НЬЮ-ЁРК — ВАРШАВА, травень-чэрвень 2006 г.



(Фота З. Пазьняка)

*Беларуская дэманстрацыя ў Нью-Ёрку. 2006 г.*

# „ЗАЎТРА Ў ВОЛЬНАЙ БЕЛАРУСІ”!

***(Палітычны даклад на 7-м Зьезьдзе Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі—БНФ і 9-м Зьезьдзе Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”. Скарочана.)***

## *І. АГУЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА*

Уздым нацыянальнага беларускага адраджэньня пачаўся ў 1905 годзе, сто гадоў таму. Перад гэтым былі паўстаньні, падрыхтоўчы пэрыяд і барацьба, змаганьне за вяртаньне Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага. Але менавіта ў канцы XIX — пачатку ХХ-га стагоддзяў змаганьне нацыянальна ідэнтыфікавала сябе як беларускае. Вялікае Княства вярталася ў сваіх нацыянальна-этнічных межах і ў новым вобразе — Беларусі. Ідэалёгіяй гэтага вяртаньня было „адраджэньне”, гэта значыць адраджэньне беларускай культуры і дзяржавы ў этнічных межах і на грунце ВКЛ.

Структура беларускага грамадзтва тады выглядала так: бальшыня насельніцтва (каля 90%) у выніку адпаведнай акупацыйнай палітыкі жыло ў вёсках і мястэчках і займалася сельскай гаспадаркай. Гарады былі зрусіфікаваныя ў афіцыйнай частцы (улада, бюракратыя) і неаднародныя ў частцы сацыяльнай — у сярэднім больш трацiны насельніцтва беларускіх гарадоў тады складалі габрэі, якія паддаліся русіфікацыйнай палітыцы.

Таму заканамерны быў моцны ўплыў народніцтва на беларускае адраджэньне. Адраджэнцы лягічна аддавалі прыярытэт вёсцы, плянуючы будучыню народа і беларускай дзяржавы. Яны спадзяваліся на нацыянальную адукацыю і асьвету менавіта беларускай вёскі, адкуль павінны былі б натуральна вырасьці новыя інтэлектуальныя дзейныя і творчыя сілы беларускай нацыі, якія ўзялі б у свае рукі яе будучыню і дзяржаўнасьць. Гэтыя сілы пераўтварылі б горад і адрадзілі б натуральныя сацыяльна-культурныя дачыненьні ў дзяржаве.

Тут было правільнае і адэкватнае бачаньне пэрспэктывы адраджэньня. Гэтакім шляхам прайшлі потым Чэхія, Славакія, Латвія, Эстонія, Летува (Жамойць) і іншыя краіны. Сялянства было тады магутным этнічным грунтам нацыянальнага разьвіцьця.

Захапіўшы Беларусь, расейскя бальшавікі галоўны удар накіравалі на нацыянальную эліту (інтэлігенцыю), якую ў бальшыні фізічна ліквідавалі, і на беларускае сялянства. За 70 гадоў яго сацыяльна вынішчылі пад корань, лепшых вывезьлі ў Сібір, згнаілі ў Гулагу, расстралялі ў Курапатах, затапталі і зглумілі сялянскую культуру, груба саветызавалі сялянскую сьвядомасьць, вырабілі тып прыгоннага сялянскага нявольніка, без зямлі, без уласнасьці, які каб выжыць альбо уцякае ў сьвет (пасьля таго як сталі дазваляць сялянам перамяшчэньне ў канцы 50-х), альбо працуе за мізэрную зарплату наёмнікам ў калгасе.

У 60-х — 70-х гг. ратуючыся ад безвыходнасьці масы сялянаў уцякалі ў гарады. Горад стаў беларускім па насельніцтву, але ня стаў беларускім па культуры. Сялянства ў гарадох было зрусіфікаванае, традыцыйная гарадзкая культура разбураная, а новая не стварылася. Па мэнтальнасьці беларускія гарады ператварыліся ў вялікія вёскі, дзе людзі ня ведалі адзін аднаго.

Разбурэньне сялянства, потым масавыя уцёкі яго ў савецкія гарады на наёмную працу і мэнтальнае рзбурэньне гарадзкой культуры, — усё гэта адлюстроўвала нацыянальна-культурную катастрофу грамадзтва.

Новае адраджэньне пачалося ў 80-х. Нешматлікі нацыянальны авангард, які вылучыўся ў гэты час, сьмелым змаганьнем, скарыстаўшы абставіны агульнага распаду СССР, і прысутнасьць актыўнай фракцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, дамогся ў 1991 годзе незалежнасьці Беларусі. Але масы зрусіфікаванага саветызаванага народа і заняпалай вёскі засталіся на ранейшым узроўні нацыянальнага разбурэньня і глуму, які пакінуў пасьля сябе расейскі камунізм. Авангард застаўся без падтрымкі народа і непрыяцель зноў завалодаў народнай крэпасьцю.

Такім чынам другое беларускае адраджэньне 80-х — 90-х гадоў і цяперашняе імкненьне збавіцца ад прамаскоўскаа рэжыму і акупацыйнай палітыкі адбываюцца ўжо пры іншай сацыяльнай структуры грамадзтва, чым некалі. У адраджэнцаў пачатку ХХ стагоддзя, якія таксама ўяўлялі нацыянальны авангард, было заплечча, сялянскі запас, магутны этнічна-народны патэнцыял, зь якога павінна была адрадзіцца нацыя і дзяржаўная будучыня Беларусі.

Гэтая добрая ідэя, аднак, на пачатку была наскрозь народніцкай, бо не відаць было выразнага разуменьня ў адраджэнцаў, што толькі стварэньне беларускага горада, дасьць нармальны грунт для адраджэньня нацыі і нацыянальнай дзяржавы. Горад ёсьць вышэйшай і арганізуючай формай грамадзкай сацыяльнай культуры, які стварае эфэктыўны мэханізм культурнага ўзаемаабмену ў грамадзтве і цывілізаванага яго разьвіцьця. Тым часам у адраджэнцаў пачтку ХХ ст. (асабліва ў літаратуры) блукалі ідэі аб сапсутасьці, чужасьці горада і супрацьстаўленьня вясковай культуры насуперак гарадзкой. Гэтае аднабокае народніцтва пачало пераадольвацца ў створанай бальшавікамі БССР. Але было ўжо позна. Будаваць Беларусь акупанты беларусам не дазволілі. Пачаліся масавыя рэпрэсіі і генацыд насельніцтва.

Структурныя і мэнтальныя перамены ў беларускім грамадзтве, якія адбыліся цягам ХХ стагоддзя ў выніку камуна-расейскага генацыду і русіфікацыйнай палітыкі, мелі жахлівыя вынікі. Аднак народ выжыў, жыве беларуская нацыя і беларуская ідэя. Структурныя перамены ў грамадзтве не зьяўляюцца таксама повадам для пэсімізму, бо нягледзячы на страты, нацыя цывілізацыйна ўдасканалілася і насуперак маскоўскай палітыцы разьвілася тэхналягічна значна лепш, чым усе іншыя краіны былога СССР. Гэта не парадокс, а заканамернасьць, якая вынікае з цывілізацыйнага ўзроўню і добрых якасьцяў беларускага інтэлекту і народнай мэнтальнасьці, пра якія мы часам забываемся і не ўспамінаем, сканцэнтраваўшыся на ідэалягічных пытаньнях.

Па структуры Беларусь ёсьць тыповая краіна індустрыяльнага грамадзтва, дзе бальшыня насельніцтва (амаль 75 адсоткаў) жыве ў гарадах, дзе разьвітая прамысловасьць, высокая навукаёмкасьць вытворчасьці, адукацыя і кваліфікацыя занятых у ёй людзей. Нагадаю, што грамадзтвы трэцяга сьвету характарызуюцца з дакладнасьцю наадварот і вызначальнымі зьяўляюцца якраз суадносіны паміж гарадзкім і сельскім насельніцтвам. Беларусь па структуры ёсьць стопрацэнтовая эўрапейская краіна. На пачатку 90 гг. у Беларусі быў самы высокі ва усходняй Эўропе цывілізацыйна-эканамічны патэнцыял. Калі б беларускія адраджэнцы дасягнулі тады улады, Беларусь стала б дзівам, самым магутным эканамічным „драконам” у гэтай частцы Эўропы.

Дарэчы, гэтыя фэнамэнальныя магчымасьці Беларусі яшчэ на пачатку 90-х гадоў былі з трывогай прааналізаваныя расейскімі дасьледчыкамі. Моцная эканамічна разьвітая Беларусь, якой яе бачыў Беларускі Народны Фронт, і, якой яна магла б стаць, уяўлялася крамлёўцам пагрозай імпэрскаму існаваньню Расеі. Потым Масква рабіла ўсё магчымае, каб не даць нацыянальна і эканамічна разьвівацца Беларускай дзяржаве. Крэмль прыняў дактрыну, накіраваную на ліквідацыю беларускай дзяржаўнасьці і на інкарпарацыю Беларусі ў Расею. У гэтай сітуацыі асэнсаваньне расейскіх паводзінаў бальшынёй беларускай палітычнай эліты ўяўляе сабой меркананьне цалкавіта сьляпых, пазбаўленых уяўленьня што такое сьвятло. Гэтакае „бліндзіраванае” ўспрыняцьце найбольш спрыяе пасьпяховасьці антыбеларускай палітыкі.

Якія аб'ектыўныя высновы вынікаюць з аналізу структурнай сітуацыі грамадзтва? Першая і галоўная. ***Генэральнай палітычнай задачай усяго беларускага Адраджэньня і кожнай адраджэнскай арганізацыі (партыі, клюбу, фонду і г.д.) павінна стаць нацыянальна-культурная асьвета і адукацыя насельніцтва. Пераскочыць праз гэты неабходны этап немагчыма. Калі яго ігнараваць, тады беларусы-адраджэнцы ніколі не дасягнуць улады ў сваёй краіне, а значыць і не абдудуюць нацыянальную дэмакратычную дзяржаву высокага духоўнага жыцьця, культуры і матэрыяльнай дастаткавасьці.***

Змагньне толькі нацыянальным авангардам супраць агрэсіі эўраазіяцкай Расейскай Імпэрыі і заходняга калябарацыянізму можа прынесьці толькі кароткачасовую перамогу, а страта пазыцыяў суправаджаецца вынішчальным разбурэньнем культуры. Пра гэта сьведчыць уся наша гісторыя пад расейскай акупацыяй.

Другая відавочная выснова: ***прыярытэтам у застасаваньні адраджэнскай палітычнай ініцыятывы павінны стаць горад (гарадзкое насельніцтва) і моладзь — тут ёсьць цяпер вырашальныя сілы нацыі.***

Заўважце, што гэбізм і Лукашэнка, ствараючы грамадзкую падпору сваёй уладзе, паставілі на сацыяльна беспэрспэктыўныя сілы (калгасьнікі, пэнсіянеры, бюракратыя), якіх яны ўзялі фактычна ў закладнікі.

Высновы з аналізу гэтага — відавочныя. Калгаснае сялянства вынішчыюць, вёска дэградуе — гэта факт: прарасейскі рэжым дабівае беларускае сялянства, якое бесперапынна затоптвалі амаль сто гадоў, але гэтым яны ня зьнішчылі і ня зьнішчаць Беларусі, толькі наблізяць свой канец. Мы яшчэ адродзім і нашу вёску і нашае сялянства.

На разуменьні цяперашняга мэнтальнага і структурнага стану грамадзтва грунтуецца наша адраджэнская фронтаўская палітыка.

## *II. ІДЭАЛЫ І ЎНУТРАНАЯ ПАЛІТЫКА*

Наша ўнутранная палітыка згодна нашай праграмы падзяляецца на першачарговую (праграма-мінімум) і агульную. Каб ажыцявіць агульныя праграмныя пераўтварэньні неабходна ліквідаваць прамаскоўскі акупацыйны рэжым. Сіла, якая можа ўзьняць і салідарызаваць народ на перамогу — гэта ёсьць Беларуская нацыянальная ідэя. Гэтая ідэя мусіць жыць у галовах і сэрцах беларусаў. Шлях да яе ляжыць праз асьвету, адукацыю, інфармацыю, прыватную ўласнасьць і ўсьведамленьне агульнасьці нацыянальных інтарэсаў.

Мы абавязныя спрыяць гэтаму шляху і церабіць яму дарогу. Абапіраючыся на нацыянальныя інтарэсы і дэмакратычныя прынцыпы ўлады мы павінны арыентавацца на ўвесь беларускі народ, на каштоўнасьці, якія аб'ядноўваюць усіх перад пагрозай расейскай агрэсіі і страты незалежнасьці.

Прынцыпы салідарнага змаганьня з чужародным рэжымам выкладзеныя намі ў народнай плятформе „Беларуская Салідарнасьць” Нагадаю некаторыя палажэньні:

***— Беларуская Салідарнасьць гэта ёсьць плятформа Беларускага Адраджэньня, форма ідэйнай лучнасьці паміж беларусамі і пазыцыя змаганьня з акупацыйным антыбеларускім рэжымам. Яе дэкларацыя салідарнасьці простая і надзейная, па прынцыпу Каліноўскага:***

***— Каго любіш?***

***— Люблю Беларусь.***

***— Дык узаемна.***

***— Зьместам беларускага яднаньня ёсьць Беларуская нацыянальная дзяржава. Сымваламі Беларускай дзяржавы ёсьць нацыянальны Бел-Чырвона-Белы Сьцяг і гэрб Пагоня.***

***— Беларуская Салідарнасьць стаіць за праўду Беларускага Адраджэньня, якое кажа: „Не правы чалавека — галоўнае для беларусаў, а незалежнасьць і свабода, бо не бывае „правоў чалавека” пад акупацыяй”. Трэба змагацца за свабоду і вызваленьне Беларусі, а не прасіць „правоў” у рэжыма і акупантаў. Акупанты правоў не даюць. Яны пакідаюць нам „права” быць рабочым матэрыялам дзеля іхных імпэрскіх інтарэсаў.***

***— Усіх беларусаў як нацыю злучае і яднае беларуская мова, беларуская гісторыя, беларуская зямля, беларуская культура, беларуская дзяржава і ўся беларуская супольнасьць людзей — Беларускі Народ.***

***Формы дзейнасьці Беларускай Салідарнасьці могуць быць рознымі, але заўсёды павінна ўлічвацца антыбеларуская палітыка прамаскоўскага рэжыму на Беларусі і пагроза нашаму нацыянальнаму, культурнаму і дзяржаўнаму існаваньню. Таму ва ўсіх справах — Беларусь перад усім. Трэба шанаваць усё беларускае. Шанаваць беларускую дзяржаўнасьць. Шанаваць беларускую мову і беларускі народ. Шанаваць беларускую зямлю і беларускую культуру. Шанаваць здабытак народнай працы. Беларус беларуса мусіць бараніць перад небясьпекай. Беларус беларусу мусіць дапамагаць. Беларус беларуса павінен падтрымліваць паўсюдна на Беларусі і ва ўсім сьвеце.***

Гэта агульныя прынцыпы. На практыцы будзе ўзьнікаць шмат канкрэтных пытаньняў, адказы на якія распрацаваныя намі ў канкрэтных праграмах. Нагадаю некаторыя з гэтых пытаньняў, якія найчасьцей перакручваюць у антыбеларускай прапагандзе.

### Адносіны да Расеі:

1*) Мяжа.*

Гэтыя адносіны будуць пабудаваныя па міжнародных правілах. Нармальная мяжа і мытня (нармалізацыя мытнага заканадаўства), упарадкуе гандаль і міграцыю. Спыняцца гандлёвыя страты, якія нясе беларускі бок, спыніцца некантралюемы прыток крымінальнага элемэнту ў Беларусь. Будзе ўведзены візавы рэжым зь мінімальнай візавай аплатай, з льготамі для пэўных катэгорыяў людзей, напрыклад пэнсіянераў, сваякоў (бязвізавы праезд) і інш.

Упарадкаваньне мяжы на ўсходзе створыць умовы для аблягчэньня памежнага рэжыму на захадзе і поўначы з Польшчай, Латвіяй і Летувой. Для беларускага насельніцтва будуць адмененыя ўсе індывідуальныя абмежаваньні на ўвоз прадуктаў і тавараў з-за мяжы, будзе ўпарадкаваны памежны гандаль на карысьць беларускіх прадпрымальнікаў.



(Фота: Аня Януковіч)

***Наш гэрб.***

2) *Нафта і газ.*

Скончацца палітычныя спэкуляцыі прарасейскіх прапагандыстаў і палоханьне неінфармаваных людзей, што Масква, маўляў, адключыць газ, ня дасьць нафты, увядзе сусьветныя цэны і Беларусь загіне. Можна толькі зьдзіўляцца, што такая прапагандысцкая лухта датрывала да XXI стагоддзя ў эпоху ўсеагульнай пісьменнасьці.

Цяпер выклікаюць штучныя сваркі і сітуацыя падаецца ненармальнай, бо рэжым на Беларусі ненармальны, прамаскоўскі і ад Масквы залежны. Як толькі гэты рэжым скончыцца і на Беларусі ўсталюецца беларуская ўлада, праблемы з газам і канфлікты скончацца. Нам зручна будзе ўвесьці сусьветныя цэны на газ з Расеі (прытым яны вартыя не 160 даляраў, як на другім канцы газапровада дзесьці далёка ў Францыі, а на палову менш). Беларусь першая краіна, куды трапляе расейскі газ, цана яго тут іншая. Беларусь будзе пабіраць нармальную плату за газавы транзіт, за зямлю, за эксплуатацыю ваеннай базы (якую урад Кебіча незаконна аддаў расейцам), за вялікую шкоду экалёгіі, якую гэтая база наносіць, за выкарыстаньне велізарных аб'ёмаў вады і г.д.

І тады акажацца, што Маскве зручней прадаваць нам газ гэтак, як прадаецца цяпер і пакінуць усё як было. Лукшэнка як крэатура Масквы і савецкага КГБ ня можа вырашыць гэтае пытаньне калі б і хацеў, бо Масква жадае тут мець усё задарма ды яшчэ і газ па сусьветнай цане прадаваць і таму цісьне свайго сатрапа. Тут грызьня ў лягеры хаўрусьнікаў, а не нацыянальныя інтарэсы. Такая ёсьць праўда. І ня трэба слухаць усіх гэтых гэбоўскіх „эканамістаў", квазіэкспэртаў і „спэцоў". Ведаем мы цану іхняе „экспэртызы".

Адключыць газ у мірны час немагчыма, інакш Расея панясе велізарныя матэрыяльныя страты. Расеі гэта ня выгадна. Усё рэгулюецца міжнароднымі законамі і пагадненьнямі. Адзін раз Пуцін скочыў у авантуру, нібыта канфліктуючы з Лукашэнкам (гэта быў спэктакль) рашыў папалохаць Эўропу, адключыў газ на некалькі гадзінаў (нібыта для Беларусі). Больш ён такога рабіць ня будзе. Вядома чым гэта для Расеі тады скончылася.

Праблема расейскага газу — гэта перш за ўсё праблема Расеі, потым ужо Беларусі. Для Беларусі тут галоўнае стварыць альтэрнатыўныя крыніцы дастаўкі нафты і газу, каб ня быць прывязанай толькі да аднаго пастаўшчыка. Гэта адразу будзе зроблена пры нармальнай беларускай уладзе. Праектныя схемы ў нас гатовыя з 1993 года. І называюцца гэтыя схемы „Балта-Чарнаморскі нафтавы калектар". Ёсьць распрацоўкі і па газу. Яны ўсім вядомыя.

3) *Маёмасьць.*

Мы папярэджвалі ня раз, што ўсялякія незаконныя маёмасныя зьдзелкі з нелегітымным рэжымам Лукашэнкі па прыўлашчваньні беларускай маёмасьці ня будуць прызнаныя нармальнай беларускай уладай. Маёмасьць будзе вернутая дзяржаве і народу. Як гэта будзе рабіцца? Экспрапрыяцыі не плянуецца. Ёсьць некалькі шляхоў нацыяналізацыі і рэпрыватызацыі маёмасьці. У любым выпадку рэпрыватызацыі незаконна набытай уласнасьці, перакупшчыку будуць вернутыя сродкі рэальна заплочаныя ім за маёмасьць пры купляньні. Гэта можа быць у выглядзе акцыяў ці па іншых схемах, адпаведна з прынятымі нормамі. Аднак уласнасьць і права на уласнаьць будзе вернута Беларусі.

4) *СНД і Калектыўная бясьпека.*

На сёньняшні дзень СНД практычна ўжо амаль што не існуе. Удзел Беларусі ў гэтым штучным утварэньні пазбаўлены ўсялякага сэнсу. Беларусь выходзіць таксама з „Калектыўнай бясьпекі", ўдзельнічае ў прграме супрацоўніцтва з НАТО, маючы на ўвазе пэрспэктыву ўступленьня ў гэты блёк.

5*) Расейцы.*

Расейская гэбоўская агентура ўвесь час імкнецца мабілізаваць беларукіх расейцаў супраць беларусаў, палохаючы іх дэпартацыяй. Маўляў, калі беларусы будуць мець уладу ў сваёй краіне, дык расейцам канец, усіх высяляць у Расею. (Здавалася б чаго палохацца вяртаньня на бацькаўшчыну.) Але мы ніколі не зьбіраліся і ня зьбіраемся высяляць расейцаў за тое, што яны расейцы. За саветамі і цяпер пры прарасейскім рэжыме, прыбылыя расейцы (а іх 10 адсоткаў) карыстаюцца значна большымі правамі, чым беларусы, і ў магчымасьці атрымліваць дзяржаўныя і кіроўныя пасады, і ў праве карыстацца сваёй мовай, школай і адукацыяй (за беларускі кошт). У гэтым сэнсе беларусы па параўнаньні з расейцамі ня маюць практычна ніякіх правоў, а за родную мову рэжым іх ня толькі дыскрымінуе, але і перасьледуе. Беларусы пастаўлены ў стан акупаванага насельніцтва.

Пры беларускай уладзе з дыскрымінацыяй беларусаў па моўнай прыкмеце будзе скончана. Будзе прыняты закон аб забароне дыскрымінацыі, а расейцам, пакінуўшы ім усе іх нацыянальна-культурныя правы, дзяржава надасьць яшчэ адно права: быць лаяльнымі да беларускай дзяржавы, магчымасьць вывучаць (выбар дабраахвотны) беларускую мову і інтэгравацца ў беларускае грамадзтва.

6) *Таляранцыя, мова.*

Гэбоўскія прапагандысты паўсюдна выстаўляюць беларускую нацыянальную дэмакратыю, як „нацыяналістаў", „экстрэмістаў" і нават „фашыстаў". Словы гэтыя, прыдуманыя яшчэ за камунізмам, цяпер ўжо не выклікаюць ніякай рэакцыі і паўтараюцца выключна зь нянавісьці і ад бясьсільля.

Найбольшую нянавісьць у нішчыцеляў выклікае беларуская мова. Сьведама ці падсьведама яны разумеюць, што калі на языку ў беларусаў будзе мова, то русіфікацыі канец і настане крах усёй антыбеларускай прамаскоўскай палітыкі. Таму асаднікі, гэбэ, агентура і іншыя нішчыцелі культуры і мовы Беларусі не стамляюцца лямантаваць, што беларусы будуць іх прымушаць гаварыць па-беларуску. Трэба ведаць расейцаў, каб зразумець адкуль зьявілася такая фармулёўка.

Вядома ж, ніхто нікога ні ў чым ня будзе прымушаць. У гэтым няма патрэбы. Вяртаецца Канстытуцыя 1994 года і вяртаецца дзяржаўнасьць беларускай мовы, беларуская школа, беларускі ўнівэрсітэт, беларускае тэлебачаньне, радыё, выдавецтвы, установы культуры і г.д. — усё, што было. Усе дзяржаўныя ўстановы працуюць па-беларуску. З вопыту мы ведаем, што калі трэба, то дзяржаўны чыноўнік вывучвае ці ўспамінае беларускую мову за адну ноч. Але дзяржаўным служачым для ўспамінаньня будзе, вядома, дадзена шмат болей часу і за дзяржаўны кошт. Дзяржаўная мова для дзяржаўнага служачага стане ягоным прафесійным абавязкам, інакш ён ня будзе дзяржаўным служачым. Іншым грамадзянам дзяржава дапаможа авалодаць дзяржаўнай мовай, пойдзе насустрач іхным інтарэсам (перакладчыкі, курсы і г.д.); лаяльнасьць да беларускай дзяржавы і мовы будзе ўхваляцца правам. Беларуская дзяржава стане існаваць па беларускіх дэмакратычных законах і нікому больш не дазволіць каго-небудзь дыскрымінаваць ці зьневажаць па моўнай прыкмеце. Будзе вернута свабода веравызнаньня і роўнасьць цэркваў перад законам. Спыніцца перасьлед пратэстантаў, каталікоў, вуніятаў, лютэранаў і іншых, вернутыя будуць памяшканьні, кампэнсаваныя бязглуздыя штрафы.

Мы, беларусы, поліканфэсійны хрысьціянскі народ і наша дэмакратычная, незалежная будучыня павінна быць таляранцыйнай. Гэта значыць што мы шануем нашага чалавека і ягонае сумленьне веры, ягоны выбар і ягоную існасьць, бо ўсе мы адзін народ, дзеці адной культуры, адной гісторы, адной дзяржавы, адной мовы. Так было некалі. Талерантнасьць — гэта характэрнасьць беларускай цывілізацыі. Талерантнасьць па-беларуску — гэта годнасьць і ўзаемапавага, прызнаньне права на індывідуальнае сумленьне веры. Аснова нашай беларускай дэмакратыі сягае яшчэ ў XVI стагоддзе, некаторыя яе прынцыпы адлюстраваныя ў трох рэдакцыях Літоўскіх статутаў. Там, тады за часы ВКЛ, было юрыдычна замацавана тое, да чаго іншыя эўрапейцы, (ацалеўшыя пасьля Варфаламееўскіх начэй), дыбалі яшчэ 400 гадоў (ды й цяпер прыйшлі толькі ў маральны тупік). Нашае разуменьне таляранцыі — гэта не нявольніцтва, не ўлегласьць перад злом, не прызнаньне свабоды паскудству, як у тых, што апынуліся ў дэмакратыі праз сусьветныя войны і рэлігійную рэзь. Нам ёсьць чаму павучыцца ў сябе самых, у нашых мудрых вялікіх продкаў, і далёка ня ўсё трэба пераймаць у чужых.

## *III. ЗЬНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА І ГЕАПАЛІТЫКА.*

Старажытная Беларусь ці Вялікае Княства Літоўскае было геапалітычным цэнтрам у Эўропе, які стрымліваў агрэсіўныя тэндэнцыі Усходу і Захаду. У XVIII ст. гэтыя два накірункі агрэсіі, аб'яднаўшыся, зьнішчылі Вялікае Княства і, сутыкнуўшыся лоб у лоб, разьвязалі дзьве крывавыя сусьветныя вайны. Новая сітуацыя і палітычныя катаклізмы, якія перажыла Эўропа, ня зьнішчылі ні гэтыя адлеглыя сілы, ні гэтыя імкненьні падпарадкаваць тое, што існуе і жыве паміж Нямеччынай і Расеяй. На канец XX і ў XXI стагоддзі вострa стаіць перш за ўсё праблема разьмеркаваньня энэргарэсурсаў і пэрспэктывы эканамічнай дамінацыі ў Эўропе. Беларусь, як і раней, знайшлася ў зоне сутыкненьня геапалітычных інтарэсаў Усходу і Захаду. Хочам мы гэтага ці не, але ў нашых зьнешніх дачыненьнях геапалітыка павінна займець важнае месца. Ігнаруючы геапалітычныя інтарэсы, мы рызыкуем самым сваім існаваньнем.

Пераходзячы на канкрэтныя азначэньні трэба ўбачыць, што ні Расея, ні Нямеччына, якая імкнецца дамінаваць у Эўразьвязе і росьціць пляны ўплыву на Польшчу і былыя пднямецкія землі, не зацікаўленыя ў існаваньні незалежнай Беларусі

У рахубу ўваходзяць і транзыт энэргарэсурсаў, і двухбаковы ўплыў на Польшчу, і вяртаньне межаў СССР, і інш. Агульныя інтарэсы (як і раней) прывялі іх да супрацоўніцтва. Ганс Вік і КГБ, злучыўшы намаганьні, паспрыялі рзвалу БНФ і стварэньню ненацыянальнай неадраджэнскай, кантралюемай з усходу і захаду, квазіапазыцыі супраць Лукашэнкі. Падзеі гэтыя адбываліся ў нас на вачах, яны ўжо апісаныя і мы добра ведаем іх сутнасьць і іхны ход. Тут толькі зраблю некалькі дапаўненьняў. Яшчэ ў 1990 годзе ў публічнай дыскусіі пра дэмакратыю з адным амэрыканскім аналітыкам, прафэсарам Калюмбійскага ўнівэрсітэту (займаўся вывучэньнем СССР) я пачуў такія аргумэнты: „дэмакратыя ня ёсьць самамэтай у палітыцы Амэрыкі, а толькі сродкам для забесьпячэньня амэрыканскіх інтарэсаў”.

І далей ішла размова пра Лацінскую Амэрыку, дзе дыктатарскія рэжымы і стаўленьнікі абыходзіліся Амэрыцы занадта дорага. Экспарт дэмакратыі ўпрасьціў задачу ўплыву: і таней, і Амэрыка сама ўвайшла ў гэтыя краіны праз адчыненыя дзьверы. Палітыка эўрапейскага лібэральнага Захаду грунтуецца таксама на такіх падставах, толькі ў адрозьненьне ад амэрыканскай, характарызуецца грубым прагматызмам і бязпрынцыпнасьцю ці падвойным стандартам.

Пранікненьне ў краіну, якой зьбіраюцца дапамагаць устанаўліваць дэмакратыю адбываецца на салідарных пачатках. Яно ўзаемавыгаднае. Захад сапраўды зацікаўлены ў дэмакратыі вакол сябе, у адкрытых грамадзтвах і ў магчымасьці эканамічна заходзіць у гэтыя краіны праз шырока адчыненыя дзьверы, згодна міжнароднага заканадаўства, нічога не парушаючы. Аднак тут якраз хаваецца небясьпека для маладых дэмакратыяў, трапіць у эканамічную залежнасьць і ў падпарадкаваньне тых разбуральных працэсаў з Захаду (асабліва ў вобласьці культуры), якімі нацыя, павязаная чужымі правіламі, не ў стане будзе кіраваць.

Дапамагаючы дэмакратыі, Захад зацікаўлены стварыць сярод мясцовых дэмакратаў сваё лобі і сваё апірышча, якое будзе лёгка і беспраблемна выконваць заходнія рэкамендацыі. Для нацыянальна салідарызаваных грамадзтваў гэта вялікай небяспекі не ўяўляе, бо кожная партыя ці група стаіць на нацыянальных кштоўнасцях і нацыянальных інтарэсах. Тым часам на Беларусі, дзе грамадзтва знаходзіцца пад прэсам чужой антыбеларускай палітыкі і штучна расколата нават у дачыненьні да асноўных каштоўнасьцяў нацыі, зацікаўленае ўмяшаньне звонку можа прывесьці да антынацыяналных вынікаў. Так яно і атрымалася. Кансалідацыя беларусаў супраць прамаскоўскага рэжыму на плятформе Беларускага Народнага Фронту, якая пачалася ў 1996 годзе, была разбурана сумеснымі намаганьнямі Захаду і Масквы, нямецкай разьведкі і КГБ. Ганс Вік, непасрэдны арганізатар гэтага злачынства пад дахам АБСЭ (і пад патранатам канцлера Шродэра), ініцыятар антыбеларускай антыдзяржаўнай дзейнасьці на Захадзе, цяпер пасьля ганебнага правалу Шродэра пачаў лавіраваць, рабіць нетыповыя заявы. Але як толькі ўсталюецца беларуская дэмакратычная ўлада ў Беларусі, пытаньне аб прыцягненьні да судовай адказнасьці гэтага дзеяча-разьведчыка будзе пастаўлена арганізацыямі вольнай Беларусі.

Схема разбурэньня беларускага супраціўленьня рэжыму была простая. Пад кіраўніцтвам Віка і пад прыкрыцьцём АБСЭ была арганізаваная новая, кантралюемая Захадам і Масквой апазыцыя, у якую сабралі былых супольнікаў Лукашэнкі, агентуру КГБ, наіўных інтэлігентаў-дэмакратаў, розных рускамоўных дысідэнтаў і прамаскоўскія партыі ад камуністаў да Гайдукевіча. На гэтую справу, па прызнаньні Віка, Захад патраціў каля паўтара мільёна даляраў. Ў гэты ж час быў расколаты Беларускі Народны Фронт. Раскольнікаў-прагматыкаў далучылі да вікаўскай апазыцыі, якую Захад стаў матэрыяльна падтрымліваць і прапагандаваць, цягнуць у заходнюю палітыку. Тым часам Беларускі Народны Фронт як партыю нацыянальна-дэмакратычнага кірунку пастараліся ізаляваць ад заходняй палітыкі (БНФ перашкаджаў стасункам з гэбоўскай Масквой).

Палітычна прадажнае балота, якое стварылі заходнія гансвікі на Беларусі ўмацавала рэжым Лукашэнкі і акупацыйную палітыку Масквы, але як і трэба было чакаць, не дало ніякіх самастойных вынікаў. Гэты паразітны нарост рэжым (адначасна штурхаючы яго нагамі) выкарыстоўвае ў сваіх інтарэсах. Найбольш адмоўную ролю выканала „вікаўская апазыцыя” восеньню 2004 года, калі дапамагла рэжыму загнаць народ на антызаконны рэфэрэндум пра „вечны тэрмін” Лукашэнкі. Цяпер гэтай вікаўскай групай кіруюць калякіны-лябедзькі (камуністы і былыя лукашысты), ствараюць выбарчы антураж, але сапраўдная іхная згодніцкая і шкодная роля найбольш выразна выяўляецца ў часы выбараў і рэфэрэндумаў, калі вырашаецца лёс рэжыму, маскоўскіх інтарэсаў і прамаскоўскай палітыкі. Гэта выразна адкрылася на цяперашніх незаконных сакавіцкіх выбарах Лукашэнкі, калі новыя стаўленьнікі адвялі беларусаў ад Народнага Галасаваньня (адзінага рэальнага шансу перамагчы рэжым) і цалкам падтрымалі фальшывую выбарчую кампанію, у якой удзельнічалі па сцэнару ўлады (і атрымалі свае заплянаваныя тры працэнты, а потым зьнівеліравалі грамадзкія пратэсты).

## *IV. ДАРОБАК АДРАДЖЭНЬНЯ.*

За мінулыя два гады нашая фронтаўская партыя дзейнічала ў рэчышчы пастаўленых задачаў і запачаткаваных ініцыятываў. Вельмі важнай ініцыятывай зьяўляецца зварот у суд грамадзянаў Беларусі аб парушэньні іхных правоў у сувязі з антыканстытуцыйнымі дзеяньнямі кіраўніцтва краіны па заключэньні дамовы аб стварэньні так званай „саюзнай дзяржавы” з Расеяй. Гэтая справа працягваецца. На Беларусі магчымасьці яе ўжо практычна вычарпаныя, іск неабходна распачаць на міжнародным узроўні.

Палітычна насычаны і адказны для Фронту быў 2004 год. Практычна цэлы год. Партыя працавала над недапушчэньнем удзелу людзей ў незаконным рэфэрэндуме. Быў напісаны і распаўсюджаны шэраг матэрыялаў, абгрунтавана неабходнасьць байкоту выбараў і рэфэрэндуму і даведзена да актыўнай грамадзкасьці. Пазыцыя Партыі была правільнай, дзеяньні пасьлядоўныя, аргуманты юрыдычна і палітычна абгрунтаванымі. Якраз наша пазыцыя і аргумэнтацыя выразна адцяніла злачынства рэжыму і вікаўскай апазыцыі, якія насуперак Канстытуцыі і праву заклікалі людзей на галасаваньне і самы прынялі ўдзел у рэфэрэндуме.

2005 год у нас быў амаль цалкам прысьвечаны галоўнай задачы — падрыхтоўцы да акцыі „выбары прэзыдэнта” ў 2006 годзе. Партыяй праробленa істотная праца, асабліва па арганізацыйных момантах і па абгрунтаваньню Народнага Галасаваньня. Практычна супраць нас быў ужыты грубы антызаконны сілавы палітпрыём (ультыматум) пасьля таго як рэжым зразумеў небясьпеку для сябе Народнага Галасаваньня. Немагчымасьць майго легальнага прыезду на Беларусь і ўдзелу ў падзеях стала адной з прычынаў звужэньня абсягу Народнага Галасаваньня. Хаця тыя шансы, якія засталіся, мы, нажаль, не скарысталі напоўніцу. Не скарысталі найперш магчымасьці лакальнай перамогі ў Менску.

За два гады пасьля 6-га Зьезду Партыя правяла дзьве навукова-тэарэтычныя канфэрэнцыі „Ідэалы БНР і беларускае адраджэньне” і ўсе традыцыйныя імпрэзы зьвязаныя зь вялікімі датамі і нацыянальнымі сьвятамі.

Вялікую і пастаянную працу Партыя вядзе па стварэньні і дагляду Народнага Мэмарыялу ў Курапатах. Тут хачу выказаць вялікую падзяку ўсім ахвярным працаўнікам на гэтай ніве. Робіцца моцная і важная для Беларусі і яе народу справа.

З свайго боку я працягваў фронтаўскую дзейнасьць за мяжой. За гэты час праведзены шэраг палітычных спатканьняў і выступаў у Польшчы, Летуве і ЗША, напісана дзясяткі артыкулаў аб беларускай палітыцы, выдадзена некалькі брашураў (у тым ліку „Беларуска Расейская вайна” і „Прамаскоўскі рэжым”) і кніга палітычнага зьместу пра Антона Шукелойця, выдаваўся часопіс „Беларускія Ведамасьці”. (Тут я не залічваю творчую працу, паэму „Вялікае Княства” і іншае). Таксама ў 2005 годзе выдадзена ў ЗША некалькі нумароў газэты „Беларуская Салідарнасьць за мяжой”, арганізавана аднаўленьне выданьня газэты „Беларускі Час” у Нью Ёрку і выдадзены першы нумар. Рэгулярна з пазыцыі Фронту прымаў удзел у сходах эмігранцкіх арганізацыяў (БАЗА, Прэзыдыюм Рады БНР, Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве і інш.), дзе выступаў з дакладамі аб палітыцы Фронту і сітуацыі ў Беларусі. Адначасна разам з групай беларускай моладзі ў Нью Ёрку займаўся арганізацыяй беларускага адраджэнскага Інтэрнэту. Створна і дзейнічае афіцыйная старонка партыі БНФ і некалькі аматарскіх старонак, створана індывідуальная афіцыйная старонка і іншыя. Лічу, што Фронт павінен надаваць вялікую ўвагу гэтай справе і дзейнасьці ў электроннай інфармацыі.

### *V. ПАЗЫЦЫЯ І ПЭРСПЭКТЫВЫ.*

Гаворачы пра нашую пазыцыю нагадаю, што Беларускі Народны Фронт — гэта вынік палітычнай дзейнасьці беларускага народа. Фронт ствараўся самастойна, абапіраўся на беларускіх людзей і на свае структуры і дасягнуў мэты, ліквідаваў КПСС у Беларусі і вярнуў незалежнасьць краіны. Існаваньне Захаду і заходняй палітыкі тады нас моцна не турбавала (хоць мы заўсёды аналізавалі яго пазыцыю), бо ніводная асоба адтуль, дзякуй Богу, не прыяжджала да нас са сваімі прапановамі. Захад тады спадзяваўся яшчэ на Савецкі Саюз і падтрымліваў Гарбачова.

Гэта я ўспамінаю невыпадкова, каб нагадаць, што наш нацыянальны лёс ёсьць у нашых руках і ўладкаваць нашую беларускую будучыню можам толькі мы, беларусы, і ніхто іншы. Сіла ў нас самых і сіла наша. Але мы не павінны выключаць кантактаў і салідарнасьці з нашымі суседзямі і з нашымі прыхільнікамі на Захадзе. Усё мусіць быць адэкватным і ў межах салідарнай палітыкі.

Рэальнасьць і сітуацыя паказвае, што найбліжэйшымі прыхільнікамі незалежнай нацыянальнай дэмкратычнай Беларусі зьяўляюцца Польшча і Украіна, а таксама балтыйскія краіны. Праўда, польскія палітыкі, якія цяпер ва ўладзе, маючы акрамя ўсяго, дакладную інфармацыю, крыху памыліліся і заблыталі сябе дэклярацыяй супрацоўніцтва з групоўкамі „вікаўскай апазыцыі". Таму спадзяемся ад іх неўзабаве адэкватнай пераацэнкі сваёй пазыцыі. Тое, што краіны былой Рэчы Паспалітай і акрэсьленай намі БЧС выказваюць салідарнасьць з нацыянальна-дэмакратычнай Беларусяй — гэта абумоўлена аб'ектыўнымі палітычнымі прычынамі і адначасова ёсьць добры знак, які паказвае, што як толькі Беларусь вызваліцца ад прамаскоўскага акупацыйнага рэжыму, цэнтральна-усходняя Эўропа салідарызуецца разам, пачнецца фармаваньне ўсходняй садружнасьці. Наша ідэя БЧС ужо завалодала разумамі ўсходнеэўрапейскіх лідэраў. Астатняе — пытаньне часу.

Тым ня менш, як эўрапейская краіна, мы павінны выяўляць прыхільную пазыцыю да Эўразьвязу і стаяць тварам да Эўропы. Вольная дэмакратычная Беларусь павінна будзе супрацоўнічаць з Эўразьвязам не сьпяшаючыся туды ўступаць, і тварыць салідарнасьць Усходняй Эўропы.

Ва ўнутранай палітыцы, як я ўжо адзначыў, наша апора павінна быць на плятформу „Беларуская Салідарнасьць" і на кансалідацыю людзей вакол беларускай нацыянальнай ідэі. Рэжым лягчэй перамагчы абапіраючыся на салідарную нацыю. Але перш за ўсё павінна быць арганізаваная авангардная салідарная сіла, што трымае сьцяг народнага адзінства. Раней такой сілай быў Беларускі Народны Фронт. Пасьля расколу БНФ ні адна з частак ужо аб'ектыўна (фармальна) ня будзе прынята народам за аснову адзінства (бо адзінства раскалолася). Для паправы становішча намі створана „плятформа народнага яднаньня — Беларуская Салідарнасьць". Але павінна быць дзейнасьць. Беларусы цяпер, як і тыбетцы, робяцца сусьветнай нацыяй. Змаганьне за Беларусь перанесена таксама і ў эміграцыю і адбываецца на трох кантынентах.

Паўстае задача аб'яднаньня ўсіх беларускіх адраджэнцкіх сілаў на Бацькаўшчыне і ва ўсім сьвеце, каардынацыя і злучэньне працы дзеля незалежнасьці і волі Беларусі. Фактычна ў беларускім сьвеце існуе рэальная і актыўная пазыцыя, якую можна акрэсьліць як „Беларускае народнае адраджэньне". Трэба зрабіць толькі крок, каб ператварыць яе ў мэтанакіраваны, сусьветны беларускі рух. Каардынатарам гэтага руху магла б стаць Кансэрватыўна-Хрысціянская Партыя — БНФ зь яе палітычнымі і тэхнічнымі (інтэрнэтнымі) рэсурсамі.

Гэтую ідэю я прапанаваў бы сябрам Фронту абмеркаваць пасьля Зьезду ў спакойных абставінах, у тым ліку і ў беларускім інтэрнэце. У бягучым годзе ў выніку станоўчага падыходу і належных ацэнак магчымасьцяў, мы маглі б сабраць Фронтаўскую партыйную канфэрэнцыю пасьвечаную гэтай праблме — беларускага народнага яднаньня перад абліччам пагрозы існаваньню дзяржавы і нацыі. Трэба ўлічыць што пасьля рэалізацыі трэцяга тэрміну Лукашэнкі гэтая пагроза і агрэсіўнасьць Масквы рэзка павялічыліся. Відавочнымі сталі імкненьні рэжыму поўнасьцю ліквідаваць грамадзянскую супольнасьць у Беларусі (згодна з ужо аб'яўленымі распрацоўкамі Масквы) і зачыніць нашу партыю, шляхам стварэньня фармальных прычынаў. Мы павінны ўлічваць пагаршэньне рэжыму і падрыхтоўку чарговай палітычнай агрэсіі з Расеі.

У любых абставінах, аднак, мы павінны памятаць цяпер пра нацыянальна-асьветніцкія задачы нашай дзейнасьці. ***Без нацыянальнай асьветы грамадзтва перамога над акупацыйным рэжымам і антыбеларускай уладай недасягальная.***

Паважаныя фронтаўцы, наперадзе яшчэ цяжкае змаганьне, але і сьветлая перамога. Беларусь была, ёсьць і будзе жыць! Наша праца яшчэ дасьць вялікі плён. Не апускайма рук, майма сьмеласьць і цярпеньне. Заўтра у вольнай Беларусі!

***Зянон Пазьняк***
*Старшыня Беларускага*
*Народнага Фронту „Адраджэньне"*
*і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай*
*Партыі -- БНФ*

*27 траўня 2006 г.*

## БЕЛАРУСЫ ПАВІННЫ РЫХТАВАЦЦА ДА ВАЙНЫ З РАСЕЯЙ . МАСКВА ПЛЯНУЕ АНЭКСІЮ

Дырэктар расейскага Цэнтру стратэгічных дасьледаваньняў Андрэй Піянткоўскі ў інтэрв'ю радыё Свабода адзначыў, што ў Крамлі сасьпеў „цьвёрды плян завяршыць апошні тэрмін прэзыдэнцтва Уладзімера Пуціна рэальным „аб'яданьнем" зь Беларусьсю. „Гэта вельмі вялікая памылка,— асьцерагаецца Піянткоўскі, — за 10 гадоў у Беларусі ўзьнікла нацыянальная самасьвядомасьць. Нават калі Лукашэнка паабяцае аб'яднаць Беларусь з Расеяй, гэта выкліча вельмі сур'ёзны крызіс. Я спрабую гэта патлумачыць у Маскве, але там настолькі ў нафтавым і газавым чадзе, што ня хочуць лічыцца з абсалютна відавочнымі аргумэнтамі". Паводле Піянткоўскага, Расея ў сваёй спробе праглынуць Беларусь ідзе да вялікага правалу.

Набліжаецца час, калі беларусам трэба ўзяць у рукі зброю і пахаваць агрэсіўную імпэрыю пад яе ўласным друзам.

***Тамаш Ракса***

*(Паводле радыё Свабода, 4 траўня 2006)*

## ВЫКАЗВАНЬНЕ АГЕНТА

У Вільні на травеньскім форуме кіраўнікоў краінаў у рамках міжнароднай Віленскай кафэрэнцыі-2006 „Агульнае бачаньне дзеля агульнага суседзтва" выступаў былы кіраўнік расейскай тэлекампаніі НТВ штатны агент Лубянкі (рассакрэчаны генэралам Каржаковым) а цяпер „палітычны аналітык" Яўгеній Кісялёў.

Ён сказаў: „Расея паспрабуе праглынуць Беларусь, стварыць унітарную дзяржаву, куды цяперашняя незалежная Беларусь увайшла б на правах аўтаномнай рэспублікі ці якога-небудзь „Беларускага краю".

***Тамаш Ракса***

## VII ЗЬЕЗД КАНСЭРВАТЫЎНА-ХРЫСЬЦІЯНСКАЙ ПАРТЫІ — БНФ І IX ЗЬЕЗД БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ „АДРАДЖЭНЬНЕ"

27 траўня ў Менску адбыўся VII Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне". Сойм

заслухаў палітычны даклад сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, — „Заўтра ў вольнай Беларусі". Са справаздачнымі дакладамі выступілі намесьнікі старшыні Фронту і Партыі, сакратары Управы і кіраўнікі камісіяў. Былі абмеркаваны сітуацыя ў Беларусі і за яе межамі, вынікі і задачы дзейнасьці Фронту і Партыі. Выступілі таксама дэлегаты Зьезду з розных рэгіёнаў краіны, якія распавялі аб сітуацыі ў Беларусі і працы рэгіянальных арганізацыяў Фронту і Партыі. У адпаведнасьці са Статутам былі праведзены выбары Старшыні, намесьнікаў і Сойму Фронту і Партыі. Старшынём Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ быў абраны сп. Зянон Пазьняк. Намесьнікамі старшыні дэлегаты абралі сп. Юры Беленькага (выканаўца абавязкаў старшыні ў Беларусі) і сп. Сяргея Папкова. Быў таксама абраны Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ у складзе 38 сяброў. У выніку дыскусіяй была прынята таксама рэзылюцыя „Абараніць незалежнасьць Бацькаўшчыны". Заля, у якой адбываўся Зьезд, была ўпрыгожана нацыянальнымі Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі і выявамі гэрбу „Пагоня". Працу Зьезду дэлегаты распачалі і завяршылі сьпяваньнем гімну „Магутны Божа".

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
*27 траўня 2006 г. Менск*

# АБАРАНІЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

### *VII Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, IX Зьезд Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне". Рэзалюцыя*

Беларусь знаходзіцца ў цяжкім нацыянальным, палітычным і гаспадарчым стане ў выніку прарасейскай палітыкі, якую мы называем рэжымам унутранай акупацыі. Бо дзяржаўная ўпада, зь ведама і пры садзеяньні А. Лукашэнкі, апанаваная спэцслужбамі Расеі, а сам кіраўнік выканаўчай улады Беларусі праводзіць адкрытую прамаскоўскую і антынацыянальную палітыку, накіраваную ў канцовым выніку на ліквідацыю дзяржаўнай незалежнасьці Бепарусі і структурнае разбурэньне бепарускай нацыі.

Зачыненыя беларускія школы і вучэльні, зьнішчаны беларускамоўны пэрыядычны друк і зьмяншаецца кнігадрукаваньне. ліквідаваная свабода беларускага слова і свабода беларускай інфармацыі, разбурана прадпрымальніцтва,: у катастрафічным стане знаходзіцца сельская гаспадарка, дэградуе эканоміка: адсутнічаюць дэмакратычныя выбары і дэмакратычнае заканадаўства.

Рэжым вынішчае ўсё беларускае, замахнуўся ўжо на Саюз пісьменьнікаў, на моладзь, на Быкава і Скарыну, пад камандай Масквы імкнецца цалкам ліквідаваць грамадзянскую супольнасьць у Беларусі, насаджае ўзамен антыбеларускія, антыграмадзкія, расейска-фашыстоўскія арганізацыі.

Рэжым пад ціскам Масквы рыхтуе ўвядзеньне на Беларусі расейскіх грошай. Фактычна адбылося падпарадкаваньне Маскве беларускага войска. Пад звон заяваў пра нібыта „нацыянальныя інтарэсы" пляную-ць здачу беларускіх стратэгічных прадпрыемстваў расейскаму капіталу. У бліжэйшы час, пры зьяўленьні зручнага моманту, Масква пляхуе прымусіць рэжым правесьці чарговы незаконны і ашуканцкі рэфэрэндум аб так званым „канстытуцыйным акце", у выніку прыняцьця якога Масква атрымала б адкрытую дарогу для інкарпарацыі Беларусі. Сытуацыю трэба ацэньваць сур'езна, як праблему жыцьця ці сьмерці. Усе беларусы павінны ўсьвядоміць, што страціўшы дзяржаву і незалежнасьць, яны страцяць усё, бо перастануць быць гасладарамі на сваёй зямлі. Іхняе існаваньне і жыцьцё будуць вырашаць іншыя — расейскія кагэбісты, крымінальнікі, чыноўнікі і алігархі, якім лёс Беларусі і беларусаў ня тое што абыякавы, але і ненавісны. Сьмерць у расейскім войску і на расейскіх войнах — гэта яшчэ ня ўсё, што беларусаў чакае пасьля страты Беларускай дзяржавы.

З выказваньняў і пісаньняў цяперашніх расейскіх палітыкаў і аналітыкаў вынікае, што плянуюць выцісканьне беларускага насельніцтва ў Сібір і адданьне нашай зямлі чужакам. Расеяй кіруе цяпер НКВД-КГБ. Мы памятаем што яны рабілі зь людзьмі ў 20-х — 30-х — 40-х гадах, назіраем што яны робяць цяпер і ведаем на што яны здольныя. Беларусы, абараняйма сябе, сваю будучыню, сваю зямлю, сваю дзяржаву, свой народ!

Недапушчэньне рэфэрэндуму аб так званым „канстытуцыйным акце" ёсьць першачарговая задача ўсяго беларускага грамадзтва. Калі ж такі рэфэрэндум будзе народу навязаны антынацыянальным рэжымам і Масквой, беларускі народ мусіць выкарыстаць эфектыўныя дзеяньні ў абарону незалежнасьці Бацькаўшчыны.

Беларусы мусяць цяпер змагацца за абарону незалежнасьці дзяржавы на ўсіх узроўнях дзейнасьці, ва ўсіх сфэрах жыцьця і ва ўсім сьвеце. Нельга пакідаць без адказу ніводнай зьнявагі сувэрэнітэту, ніводнай антыбеларускай вымовы, ніякіх, нават дробных, закідаў супраць Беларусі. Мусіць быць створана атмасфэра і дух змаганьня за вольную Беларусь. Барацьба за абарону Бацькаўшчыны спрыяе згуртаваньню людзей. Змагацца трэба. Формай змаганьня павінна стаць Беларуская Салідарнасьць. Усе беларусы павінны падтрымліваць адзін аднаго, абараняць волю і незалежнасьць Айчыны. Гэта дарога да нацыянальнай сілы. І толькі калі створым такую беларускую сілу, толькі тады здолеем ажыцьцявіць перамену ўлады, скончыць з прамаскоўскім рэжымам, вярнуць справядлівасьць і павагу людзям, палепшыць жыцьцё ў сваёй краіне і гарантуем яе свабодны, шырокі і сьветлы шлях.

*27 траўня 2006 г. г. Менск*

# ПАСТАНОВЫ

Прынята на 6-м Зьезьдзе
Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.
Пацьверджана на
VII Зьездзе Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ

### Аб абавязку сяброў Кансэрватыўна-Хрысъціянскай Партыі — БНФ (Партыі — БНФ) у падтрымцы палітыкі Партыі і аб адказнасьці за выкананьне палітычных рашэньняў і праграмы Партыі.

Пацьвярджаючы актыўную палігычную пазыцыю і адпаведнасьць, Праграме Партыі БНФ. VII Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Цартыі — БНФ пастанаўляе:

1. Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ павінны выконваць палітычныя рашэньні кіруючых ворганаў Партыі палажэньні Праграмы Партып, дзейнічаюць у рэчышчы гэтай Праграмы і палітычных рашэньняў.

Актыўнае адмаўленьне ад выкананьня палітычных рашэньняў кіруючых ворганаў Партыі і Праграмы Партыі, актыўнае адмаўленъне ад палітычнай дзейнасьці альбо выступленьне супраць палітыкі Партыі і Праграмы Партыі не адпавядае вобразу сябра Партыі і сэнсу ягонага сяброўства ў партыйнай арганізацыі.

2. Структуры Партыі (пры неабходнасьц! — асобныя сябры Партыі) павінны давадь справаздачную інфармацыю кіруючым ворганам Партыі аб працы па палітычных праграмах і аб ажыцьцёўленых мерапрыемствах.

3. Кантроль за выкананьнем гэтай Пастановы, распрацоўку парадку яе ажыцьцяўленьня і прыняцьце захадаў па яе выкананьні (у тым л!ку — па сяброўству ў палітычнай арганізацыі) ускладаецца на Сойм Партыі.

*27 траўня 2006 г.*

Прынята на 6-м Зьезьдзе
Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ
Пацьверджана на VII Зьездзе Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ

### Аб разьвіцьці Партыі БНФ

Улічваючы грамадзка-палітычныя; абставіны ў краіне, асаблівасьці сацыяльна-адміністрацыйнай структуры грамадзтва і патрэбы партыйнага разьвіцьця, VII Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ (Парты БНФ) пастанаўляе:

1. Лічыць апраўданым стварэньне адмысловых (тэматычных) камісіяў і пастаянна дзеючых сэмінараў пры Сойме Партыі БНФ (зь філіямі ў іншых месцах) на правах першасных арганізацыяў (суполак)
2. Распрацоўку парадку дзейнасьці адмысловых (тэматычных) камісіяў і пастаянна дзеючых сэміараў, арганізацыю і кантроль ускласьці на Сойм Партыі БНФ.

*27 траўня 2006 г.*

## РЭГІСТРАЦЫЯ ФРОНТУ.

***(Урывак з успамінаў)***

Нягледзячы на тое, што Народны Фронт утварыўся ў 1988 годзе, даволі доўгі час камуністычныя ўлады адмаўляліся яго афіцыйна рэгістраваць. Займацца рэгістрацыяй Фронта ўзяўся адзін з намесьнікаў старшыні Юры Хадыка.

Час ішоў, а справа ня рухалася. Масавая і адзіная на той час палітычная арганізацыя ня мела юрыдычнага статусу. Ужо адбыўся першы шматтысячны Чарнобыльскі Шлях, была адкрыта праўда пра Чарнобыль. Фронт жыў і дзейнічаў. Была ўтворана Чарнобыльская камісія Беларускага Народнага Фронту, якую ўзначаліў Генадзь Грушавы. Міжнародны аўтарытэт і вядомасьць Фронта ўзрасталі. Чарнобыльская камісія Фронта пачала пасьпяхова дзейнічаць. Беларускіх дзяцей запрашалі на аздараўленьне ў розныя заходнія краіны. Савецкай дзяржаве ніякага даверу з боку гэтых краінаў не было. Давяралі толькі Фронту. А Фронт на гэты час усё яшчэ ня быў зарэгістраваны і юрыдычнага статусу ня меў.

Раптам мы даведаліся, што Генадзь Грушавы зарэгістраваў сваю арганізацыю, узяўшы фронтаўскі назоў „Дзеці Чарнобыля". Скарыстаўшы аўтарытэт Фронта, ён паступова адыйшоў ад Фронта і пачаў самастойную дзейнасьць.

Пытаньне аб рэгістрацыі ўзьнімалася ледзь ні на кожным паседжаньні Ўправы Фронта, але зь месца ня рушылася нічога. А потым спадар Хадыка зрабіў заяву, што, маўляў, у сучасных умовах зарэгістраваць Фронт немагчыма.

Пазьняк пачаў падбіраць іншых людзей, якія б выканалі задачу. Аднойчы да мяне зьвярнулася дэпутат Вярхоўнага Савета Галіна Сямдзянава з прапановай узяцца за гэтую справу. Я пагадзілася.

Справа была няпростая. Сфармавалася група, у якую ўвайшлі яшчэ Вера Чуйко і Уладзімер Анцулевіч.

Найперш мы зрабілі візыт у Мін'юст каб высьветліць прычыны адмовы ў рэгістрацыі Фронта. І тут высьветлілася, што супрацоўнікі Мін'юста, аказваецца, „вельмі хацелі б нас зарэгістраваць". Але ж, паглядзіце, маўляў, самі. Ці ж можна такія дакументы разглядаць і вынесьці станоўчае рашэньне. Па-першае, яны былі зроблены надзвычай неахайна, па-другое, не былі выпраўленыя заўвагі Мін'юста. Датаго ж (як паведаміў нам адзін супрацоўнік Мін'юста) спадар Ю. Хадыка падчас перамоваў паводзіў сябе надзвычай груба, нават замахваўся крэслам на супрацоўнікаў.

Мы пераглянуліся: верыць яму мы не зьбіраліся. Але прагледзеўшы дакументы, якія спадар Хадыка прадставіў у Мін'юст, пераканаліся, што сапраўды, зарэгістраваць арганізацыю па гэтых дакументах было немагчыма. Выглядала ўсё вельмі дзіўна. Не абмяркоўваючы доўга гэтае пытаньне, распачалі працу. Хутка ўсе дакументы, якія патрэбныя былі для рэгістрацыі, былі дапрацаваныя.

Тады Мін'юст выставіў патрабаваньне прадставіць Праграму Фронта. Закон гэтага не прадугледжваў. Было зразумела, што прадстаўляць Праграму бессэнсоўна, гэта пацягне бясконцыя „папраўкі" Мін'юста, які прадстаўляў інтарэсы ўладных камуністаў. Справа з тупіку ня выйдзе. Мы запярэчылі: Праграма была апублікаваная ў друку, і па закону — гэтага дастаткова. Ведаючы, што апублікаваць Праграму было на той час немагчыма, чыноўнік з радасьцю ўчапіўся за гэты аргумант: „Вельмі добра. Прынясіце мне хоць адзін экзэмпляр газэты, дзе была надрукавана вашая Праграма. Гэтага тады сапраўды будзе дастаткова."

— Добра, — пагадзіліся мы, — заўтра нараніцы вы атрымаеце газэту, — і абмяняўшыся нацягнутымі ўсьмешкамі, выйшлі з кабінэту.

Мы былі ў жаху: дзе ж узяць гэты „хоць адзін экзэмпляр" газэты з Праграмай Фронта, калі яго не існуе ў прыродзе?

Але нічога ня зробіш: зарэгістраваць Фронт трэба, ня гледзячы ні на якія перашкоды. Кропка.

Заставалася адзінае спадзяваньне на зарэгістраваную газэту „Навіны БНФ", заснавальнікам якой быў Зянон Пазьняк. Яна друкавалася за межамі Менска. Гэта значыць, трэба было тэрмінова зьбірацца і за ноч зрабіць гэты „хоць адзіны экзэмпляр".

Мая задача заключалася ў тым, каб назаўтра не сьпяшаючыся, спакойна прыйсьці ў Мінюст і раўнадушна пакласьці газэту на стол чыноўніка. Астатнія павінны былі займацца самой газэтай, ня спаць ноч, але прывезьці яе нараніцы ў Менск.

Менавіта так і здарылася. (Як удалося за ноч зрабіць, аддрукаваць і прывезьці ў Менск газэту — друкарская тэхніка ж тады была вядома якая — гэта асобнае фантастычнае апавяданьне). На раніцы я аднесла ў Мін'юст газэту, паказваючы відам: „Ну бачыце, мы выконваем свае словы. Цяпер выконвайце свае і вы." У Мін'юста не засталося выхаду.

Праз нейкі час мы атрымалі Пасьведчаньне аб рэгістрацыі Фронта.

***Галіна Пазьняк***

*1998 г., Варшава*

# ЗЯНОН. ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ

**Гара**

Усё звычайна тут і проста.
Вось наш узгорак, што за лесам.
Люблю адсюль глядзець удалячынь,
Сярод палёў, жытоў і пералескаў,
На самай кромцы небаспаду,
У мгле блакітнай і смузе
Таемны, мройны і далёкі
Хвойны лес сінее.
Гара ўзвышаецца над ім.

Што за гара? —
Так прыцягальныя яе абрысы,
Так вабяць да сябе.
Пайду ў шлях, спазнаю
І на вяршыню ўзыйду.
Наперад гляну
І азірнуся ўсьлед сваёй дарозе,
Каб ацаніць набытак для душы.

І вось прыйшоў і азірнуўся.
Сярод палёў, жытоў і пералескаў,

На самай кромцы небаспаду,
У мгле блакітнай і смузе
Далёкі, мройны і знаёмы
Таемна хвойны лес сінее,
Гара ўзвышаецца над ім.
І прыцягальныя яе абрысы
Так вабяць да сябе...

*1983 г., Суботнікі*

## Жнівень

Ноччу з поўначы цёплы вецер павеяў,
Прынёс чорныя хмары.
Не ўвядзе мяне ў зман
Цёплы вецер паўночны ў жніўні.
Вось і ранак пачаўся халодным дажджом.
Белая пара стаіць над Гаўёй.
Тлумы чорных шпакоў паляцелі на ржышча.

*1983 г.*

## Прыцемак халоднай восені

Запаліліся зоркі ў небе,
І холад павеяў зь цёмных палёў.
За плячыма агні і цяпло пад страхой.
Тварам да ветру стаю.
Пах бульбянішча, мерзлай зямлі адчуваю.
Пошум крыльляў вышэй верхавін —
Шэрыя гусі лятуць.

*1984 г.*

## Яблыневае лісьце

Рэдкае лісьце яблынь
Відаць праз гардзіну вакна.
Трапеча на ветры.
Ярка мігціцца скрозь іх неба сівое.
Холадам вее.
А толькі ж учора нябёсы цьвілі,
І хадзіў я ў духмяную цень,
І спадалі пялёсткі ў травы.

*13.09.1984 г.*

## Асеньні змрок над Клявой

Гадзюкай плыве Клява
з Клявіцы ў Гаўю
І зьнікае ў змрок.
Як луска, зьзяе стужка яе
ў асеньніх лугах.
Лес кляновы даўно не шуміць.
Зьнік дазваньня, пасох.
Спарахнелі пашчэмкі дзікоў на кары.
Толькі верас і жоўтыя травы шумяць,
І кустоўе лазы.
Хаваецца сонца ў чорнай ральлі.
Патухаюць чырвоныя хмары,
Сінеюць, бягуць над лясамі.
Вецер птушкай начной
Над халоднай вадой
адлятае.

*1984 г*

## На магіле Багдановіча

Пад дрэвамі,
дзе цень халодных
надмагільляў
Каток ласкавы падышоў
І замурлыкаў ля нагі.

*1992 г., Ялта*

## Маўзалей Джаныке Ханум, 1437 год

Разрабаваны расейцамі.
За плату
аглядаюць нашчадкі
Брыдоту продкаў.

*1992 г., Бахчысарай*

## Цёплая ноч

*Калісьці даўно, у апошнюю ноч жніўня, я прышоў на бераг Дрывят. Вецер з гаркавым дымам прынёс з палёў подых восені, і такая журба наплыла на мяне. Шкода, што канчаецца лета, што так хутка праносіцца час... Можа там, на другім канцы Сьвету, за мільярдамі зор, такі ж, як і я, на беразе возера. Ці спаткаемся мы калі з табой? І тады напісаў я сабе:*

Нябачныя хвалі шумяць,
І конікі ў палыне.
А як там?
Над магілай
забітага сябра.

*1987 г.*

## Творцы

Нават малы творца
Можа стаць геніям для сьвету
У вялікага народа.
І нават геній сьвету
Будзе нікім
у народа слабога.
Бо вялікімі не нараджаюцца.
Вялікімі робяцца,
Калі народ хоча вялікіх.

## Пуга

Ідучы па дарозе,
Я спаткаў чалавека.
Ён быў вельмі яшчэ малады.
А, можа, й стары.
Бо крычаў, як юнак
І казаў, як мудрэц:
„О, воля! Свабода!
О, сьветлы дзень народны!
О, Беларусь!
О, Беларусь, мая шыпшына!
О, цьвет наш бел-чырвона-белы!”
І так хараша мне было яго слухаць.
„Пойдзем, — кажу, — змагацца
За волю, за долю.
Пойдзем — за Беларусь!”


(Фота: Сымон Печанка)

*Белы Бусел.*

„Ужо йдзем, — сказаў чалавек.—
Я йду табе ўсьлед.
Рушайма! Пайшлі!
Без аглядкі, да зор!”
І вузкай кручастай дарогай
Мы йшлі пад гару.
Абсыпалі каменьне ногі мае.
Зацінаў мне дыханьне пыл —
Але йду.
Вось і вечар ужо.
Цямнее каменнай дарогі брыло.
Азірнуўся назад —
За плячыма нікога ў мяне не было.
Тады збоку
Убачыў я йшчэ аднаго
Ён хораша граў і сьпяваў пра свабоду.
— Каго любіш? — пытаю яго.
— Люблю Беларусь.
— Дык пайшлі ваяваць.
— Я б пайшоў, але ж могуць забіць.
Толькі я павярнуўся ісьці,
Ажно бачу,
Што трэці відаць чалавек.
Ён сядзеў на скале
І ўзіраўся пад ногі.
— Ці хочаш свабоды? — пытаю яго.
— Хачу, — кіўнуў чалавек у адказ.
— То пойдзем, — кажу.
— Як пайду, тады што мне за гэта дасі?
„І што б мне было яму даць?” —
Думаў я, адыходзячы прэч.
Аж тут бачу
Шырка рукі расьпкінуў
І нагамі ў даліну
Віцька ляжыць праз дарогу.
— Здароў, Віцька! — кажу. — Беларусь любіш?
— Люблю.
— Свабоды хочаш?
— Ага.
— А ці хочаш, каб даў?
— Хачу, — ажывіўся Віцька.
— Чакай, дам.
Сказаўшы гэта, я зьвіў добрую пугу,
І, сьперазаўшы Віцьку,
Пагнаў яго перад сабой да свабоды.
От гэтак, думаю, і дойдзем,
Дойдзем мы да Беларусі.

*2004 г.*

**Парсюк**

Віцька з Вулькай
Парсючка шаравалі
(Чысьценькі-беленькі).
А ён на вуліцу выскачыў
Ды ў гразь — хрась.
І рохкае сабе, рохкае.
— Ну і сьвіньня, падла, —
Сказаў Віцька.

*2004 г.*

### Разумныя людзі

Як добра,
Калі гаворыш з разумным:
І час не змарнуеш,
І розуму набярэшся.

* * *

І тое праўда:
Лепш з разумным памаўчаць,
Чым з дурнем нагаварыцца.

* * *

Школьнага сябра спаткаў.
Пагаварылі і разышліся.
Разумныя людзі шмат не гавораць.

*1995 г., Менск*

### На сьвітаньні прачнуўся

*Жонка атрымала кепскую вестку з Радзімы і плакала цэлы вечар. Потым я напісаў:*

А вось і раніца
на чужыне́.
Ты яшчэ пасьпі,
мая любімая.
Ня бойся — Беларусь жыве.

*2002 г .*

### Настальгія

Як уцячы мне ад вас,
Калі вас няма?
Карціны мінулай пары.

*2002 г.*

* * *

У моры шэрасьці і чужыны́
Успамажэньне дае
Толькі Айчына,
Сьветлы вобраз яе ў душы
І найвялікшы Бог.

*(З цыклу „ Чужына́”) 2002 г.*

# ТРАВЕНЬСКІ СОЙМ

14 траўня ў Менску адбыўся чарговы Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адражэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. Сойм заслухаў даклад сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, — „Ветрык, вей!”:

„Падзеі апошніх месяцаў паказалі, што ў беларусаў ёсьць добры патэнцыял будучыні і нацыянальнага Адраджэньня. Гэта выявілася ў актыўнасьці моладзі, у яе гатовасьці змагацца з рэжымам за вольную Беларусь. Зразумела, што ворагі беларушчыны будуць імкнуцца першым чынам задушыць гэтае абуджэньне. Дзеяньні паліттэхнолягаў мы ўжо бачым. Тактыка тая ж тыпова лубянская: падстаўныя фігуры, падстаўныя арганізацыі, фальшывыя псэўдазмагарныя ідэі, імітацыя змагарнай дзейнасьці, безадрасны агульнадэмакратычны рамантызм і адвод грамадзкай энэргіі ў сьляпы завулак, у апэндыкс. Узорны прыклад — існаваньне эклектычнага „Зубра” (аналягічную арганізацыю стварылі ўжо на Украіне, будуць змагацца за дружбу з „демократической Россией”).

Праект адводу рэвалюцыі ў апэндыкс, які нядаўна агучылі „дэмакраты” з „апазыцыі”, характарызуецца, дарэчы, надзвычайнай прымітыўнасьцю і разьлічаны ў асноўным на дэнацыяналізаваных і нясьпелых людзей з маладзёвага асяроддзя. Прапануюць ствараць на вуліцах, і ўвогуле ў горадзе, імгненныя тэатралізаваныя сітуацыі (флэш-мобы) і адразу разьбягацца. Дзеля гэтакай рэвалюцыі аб’явілі пра роспуск „Зубра” (які ў асноўным мазаў сьцены расейшчынай) і вырашылі перакваліфікаваць яго на „мобышмобы”. Усё гэта выглядае несур’ёзнымі дзіцячымі гульнямі і паказвае на ўзровень людзей, якія за ўсім стаяць. Гэтая тэхналёгія — працяг парцянкі (джынсы). Галоўнае — любымі спосабамі адцягнуць беларускую моладзь ад нацыянальнага змаганьня, ад нацыянальнай ідэі, ад Бел-Чырвона-Белага Сьцяга, ад разуменьня расейскай пагрозы, ад нацыянальнага Адраджэньня. Задача відавочная — збэсьціць новае пакаленьне моладзі, якая заявіла пра сябе ў сакавіку гэтага года.

У сувязі з гэтым у каторы раз паўтаруся: нацыянальная асьвета людзей, беларускае асьветніцтва ёсьць і павінна быць нашым пастаянным прыярытэтам. Вайна за Беларусь вядзецца ўсімі спосабамі і ва ўсіх кірунках, але вынік гэтай вайны будзе залежыць ад перамогі ў сьвядомасьці.

Аб канкрэтных мэтадах нацыянальнага маладзёвага змаганьня я ўжо коратка пісаў раней. У бліжэйшы час пастараюся гэта сістэматызаваць. Стратэгічнай лініяй павінна стаць „Беларуская Салідарнасьць” і Адраджэньне. Тактычна трэба скарыстаць мэтады арганізацыі і спосабы дзейнасьці Камітэтаў абароны ў запачаткаваным намі тры гады таму БКА (Беларускі Камітэт Абароны). Галоўнае, што ў цяперашніх беларускіх умовах гэты мэтад нэўтралізуе шырокую дзейнасьць агунтуры. Рэжым ня здолее скарыстаць напоўніцу важную сваю зброю”.

З дакладам выступіў сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Партыі і Фронту. Ён распавёў пра апошнія агрэсіўна-імпэрскія заявы Крамля. Пуцін і ягонае атачэньне абвясьцілі чарговы ўльтыматум Беларусі. Заява цынічна адкрытая: падвышаем кошты на сібірскі газ і патрабуем, каб Беларусь уключылася ў склад Расеі. Дзесяць гадоў таму, у 1996 г. расейская імпэрыя ўжо выстаўляла нам ультыматумы. Тады змагарны народ выйшаў на вуліцы Менска і абараніў сваю незалежную дзяржаву. Цяпер агрэсары разьлічваюць, што псэўдаапазыцыі ўдалося разбурыць народны супраціў, што расейскі імпэрыялізм лёгка завалодае нашай краінай і нашымі нацыянальнымі багацьцямі. Але патрыёты Бацькаўшчыны будуць арганізоўваць супраціў агрэсіі. Увесь цывілізаваны сьвет ужо ўбачыў, што Расея ахоплена цяжкім эканамічным і сацыяльным крызісам, аб чым вымушаны казаць у сваіх выступах нават Пуцін. У анэксіі Беларусі і захопе яе чалавечых, тэхналягічных і натуральных рэсурсаў Крэмль бачыць магчымасьць пераадолець крызіс. Але беларусы не пагодзяцца быць матэрыялам для вырашэньня чужых праблемаў. Беларуская Салідарнасьць — шлях нашага народу да вызваленьня.

Выступіў сп. Валеры Буйвал, сакратар Управы Фронту і Партыі. Ён таксама нагадаў пра расейскі наступ супраць незалежнай Беларусі ў 1996 г. Тады сітуацыя была значна больш цяжкай для беларускіх патрыётаў. Многія палітыкі Заходняй Эўропы ў той пэрыяд ужо пагадзіліся на акупацыю і анэксію Беларусі Расеяй. Яны казалі беларускім патрыётам, што „шлях дэмакратызацыі Беларусі — праз дэмакратычную Расею”. За прамінулыя дзесяць гадоў, пасьля апошняй расейскай „газавай вайны” супраць Украіны і ўсяе Эўропы многія на Захадзе больш адэкватна ацанілі палітыку Расеі і адмовіліся ад публічнай падтрымкі расейскай акупацыі Беларусі. Трэба ўлічваць больш спрыяльную для нашай незалежнасьці міжнародную сітуацыю. Але справа абароны Бацькаўшчыны і пабудовы дэмакратычнай эўрапейскай дзяржавы ёсьць задачай перш за ўсё самых беларусаў. Выступілі таксама сябры Сойму. Яны распавялі пра патрыятычны ўздым у розных рэгіёнах краіны. У авангардзе нацыянальна-вызвольнага руху — беларуская моладзь, якая гуртуецца пад сьвятым Бел-Чырвона-Белым

Сьцягам. Наш народ гатовы ўстаць на абарону Бацькаўшчыны ад расейскай імпэрыі.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

*14 траўня 2006 г.*

# ГЕРАІЧНАЯ БЕЛАРУСКА

18-га чэрвеня каля трэцяй гадзіны дня на адной з асьвятляльных вежаў амфітэатру ў Віцебску зьявіўся Бел-Чырвона-Белы Сьцяг. Яго ўзьняла Крысьціна Шацікава — вядомая ўдзельніца намётавага гарадку на плошчы імя Каліноўскага ў Менску. Міліцыянты залезьлі сьледам за дзяўчынай на вежу. Распавядае сьведка — дзяўчына, якая пажадала застацца невядомай. (Дзяўчына: ) „Дзесьці ў 14.40 каля амфітэатру быў вывешаны Сьцяг. Чалавек, які гэта зрабіў ёсьць ну проста героем Беларусі! Дзяўчына вельмі рызыкавала! Потым туды ж залез міліцыянт, пачаў біць яе па галаве. Дзяўчына вельмі страшна крычала! І той самы міліцыянт потым зьняў сьцяг і скінуў."

Затрыманьне Крысьціны праходзіла вельмі жорстка: спэцназаўцы напачатку некалькі разоў ударылі яе па галаве, а потым зьвязалі рукі, замацавалі на ёй страховачны пас і пачалі спускаць уніз. Адзін спэцназавец трымаў яе за ногі, а другі, знаходзячыся зьверху, не дазваляў чапляцца рукамі за лесьвіцу ды біў па галаве. Пасьля допыту ў пастарунку дзяўчыну давялося весьці ў шпіталь хуткай мэдычнай дапамогі. Але прыйдзе час і беларусы распраявяцца з акупантамі яшчэ больш жорстка, чым яны расправуляліся з Крысьцінай Шыцікавай. Нішто іні хто ня будзе забыты.

***( Паводле радыё „ Свабода")***

# СУПРАЦЬ КАГО САНКЦЫІ?

18-га траўня Рада Эўразьвязу ўхваліла фінансавыя санкцыі супраць Аляксандра Лукашэнкі і 35 іншых вышэйшых беларускіх чыноўнікаў, адказных за парушэньні міжнародных выбарчых стандартаў і ўціск грамадзянскай супольнасьці, ды перасьлед „апазыцыі" пад час прэзыдэнцкіх выбараў 19 сакавіка 2006 году. Згодна з гэтым рашэньнем будуць замарожаныя ўсе выяўленыя рахункі і маёмасьць у краінах Эўразьвязу, зьвязаныя наўпрост ці ўскосна зь беларускімі чыноўнікамі: 30 — га чэрвеня санкцыі супраць Лукашэнкі і ягонага атачэньня ўвяла Швайцарыя. Яна далучылася да санкцыяў Эўразьвязу. Згодна з рашэньнем швайцарскага ўраду, 37-мі вышэйшым беларускім чыноўнікам са сьпісу Эўразьвязу на чале з А.Лукашэнкам забаронена ўяжджаць у Швайцарыю і перасякаць яе тэрыторыю. Акрамя таго, іх рахункі і ўласнасьць на тэрыторыі краіны будуць арыштаваныя ў выпадку, калі яны будуць знойдзеныя. Распараджэньне прадугледжвае, што асобы і ўстановы, якія займаюцца абслугоўваньнем рахункаў беларускіх службовых асоб або маюць аб іх інфармацыю, павінны неадкладна паведаміць аб гэтым у адпаведныя дзяржструктуры. Заўважце, што Швайцарыя лічыцца краінай, у якой асаблівая ўвага надаецца захаваньню банкаўскай таямніцы. А цяпер дзеля здавалася б далёкіх ад Швайцарыі палітычных прычынаў усе гэтыя расхваленыя традыцыі швайцарскіх банкаў кідаюцца пад ногі. І якім чынам — „рашэньнем швайцарскага ўраду".

Вось, аказваецца, на якія ахвяры йдуць эўразьвязьнікі дзеля дэмакратыі на Беларусі.

Аднак трэба глядзець рэальна на гэтую санкц-палітыку. Куды накіруецца лукашысцкі чыноўнік, пераканаўшыся, што ў Эўропу яго не пускаюць, што швайцарскія банкі даўно дзіравыя і што іхнымі рашэньнямі кіруе урад? Зразумела куды — у Расею. У расейскія банкі, на расейскія курорты і г.д. А калі ў Расеі апынуцца „інтарэсы" лукашысцкага асяроддзя, то і „інтэграцыя" „легчэ пайдзёт". Усё гэта робіцца не ад неразуменьня элементарных рэчаў, а якраз ад добрага нямецкага іх разуменьня. Беларускім простым людзям даўно пастаўлены жорсткі візавы заслон для выезду на заробкі ў Эўразьвяз. Бо трэба ж скіраваць іх у Расею каб працавалі і гінулі там (такая дамоўленасьць). Цяпер дайшла чарга да чыноўнікаў. Ніхто з гэтых эўрапеоідаў не клапоціцца ў сапраўднасьці пра беларускую дэмакратыю (і ні пра якую дэмакратыю). У іх тут супольны рэсурсны і геапалітычны інтэрас з Расеяй і толькі. Успомніце як немцы („Нямецкая хваля") ў мінулым годзе, атрымаўшы мільёны ад Эўразьвязу, сілком штурхалі ў беларускі эфір расейскую мову (і прыкідваліся дурачкамі — „какая разьніца"). На Беларусі аднак ёсьць людзі, якія добра разумеюць гэтую гансвікаўскую палітыку і як зь ёй змагацца.

***Мар'ян Ванькевіч***

*(З выкарыстаньнем матэрыялаў радыё „ Свабода")*

# ДАКУМАНТЫ ЧЭРВЕНЬСКАГА СОЙМУ ПАРТЫІ БНФ

### *АБ ПАЛІТЫЧНАЙ АГРЭСІІ РАСЕІ*
### *(Зварот да кіраўнікоў вялікіх дзяржаваў)*

Дзяржаўныя ўстановы, афіцыйныя кіраўнікі і палітыкі Расеі адкрыта заяўляюць аб агрэсіўных плянах ліквідацыі незалежнасьці Беларусі і інкарпарацыі тэрыторыі нашай дзяржавы ў Расею. Такія заявы ёсьць грубым парушэньнем Гэльсінскіх пагадненьняў і міжнароднага права і сталі магчымыя ў выніку сумесных дзеяньняў Расеі і рэжыму Лукашэнкі ў Беларусі. Расея настойвае на правядзеньні незаконнага рэфэрэндуму ў Беларусі аб так званым „канстытуцыйным акце" незаконнай (і ўмоўнай) „саюзнай дзяржавы" Беларусі і Расеі, прыдуманай 8-га сьнежня 1999 года за плячыма народаў Ельцыным і Лукашэнкам.

Цераз антызаконнае прыняцьце так званага „канстытуцыйнага акту" Расея плянуе ліквідаваць беларускую грашовую сістэму, увесьці расейскі рубель на Беларусі і зьнішчыць дзяржаўны суверэнітэт нашай краіны.

Мы нагадваем, што згодна Будапэшцкага Мэмарандуму 1994 года ЗША і Вялікабрытанія абавязаліся быць гарантамі суверэнітэту Беларусі, пасьля адмовы нашай краіны ад ядзернай зброі. Бязьядзернасьць Беларусі ініц'явала і падтрымлівала Апазыцыя Беларускага Народнага Фронту ў парляманце Беларусі на чале з Зянонам Пазьняком.

Цяпер незалежнасьць Беларусі пад пагрозай з боку Расеі.

Сойм Беларускага Народнага Фронту і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ зьвяртаецца да кіраўнікоў усіх вялікіх дзяржаваў „G-8" з просьбай не прыяжджаць у Санкт-Пецярбург на саміт G-8 пакуль расейскае кіраўніцтва не адмовіцца ад агрэсіўнай палітыкі супраць незалежнасьці Беларусі і ад патрабаваньняў правядзеньня незаконнага рэфэрэндуму ў нашай краіне.

***Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

*18 чэрвеня 2006 г. Менск*

### *АБ ПЛЯНАХ НЕЗАКОННАГА РЭФЭРЭНДУМУ*

Перасьцерагаем беларусаў аб чарговай небясьпецы, якую рыхтуе расейскае кіраўніцтва і прамаскоўскі рэжым у Беларусі. Зноў плянуюць незаконны рэфэрэндум па прыняцьці так званага „канстытуцыйнага акту" незаконнага, умоўна існуючага „союзного государства" Расеі і Беларусі.

Прыняцьцем „канстытуцыйнага акту" на рэфэрэндуме хочуць у чарговы раз ашукаць беларусаў, ліквідаваць беларускую фінансавую сістэму, увесьці на Беларусі расейскія грошы і зьнішчыць незалежнасьць нашай дзяржавы. Чарговы незаконны рэфэрэндум будуць прымяраць да выбараў ў мясцовыя ворганы ўлады.



(Фота: Сармат)

*Сакавік. Плошча Каліноўскага.*

Беларусы павінны памятаць пра антыбеларускі сэнс гэтага рэфэрэндуму. Нельга дапусьціць правядзеньне такога рэфэрэндуму. Калі яго накінуць прымусам — нельга будзе йсьці галасаваць. Замест паходу на выбарчыя ўчасткі трэба рыхтавацца ў гэты дзень да выхаду на вуліцы і плошчы, каб скончыць з ашуканствам і нішчэньнем нашай краіны. Гуртуйцеся вакол Беларускага нацыянальнага Адраджэньня і ягонай Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. Падтрымлівайце „Беларускую Салідарнасьць” і Беларускі Нацыянальна-Вызвольны Рух. Стварайце групы падтрымкі КХП-БНФ.

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
*18 чэрвеня 2006 г. Менск*

### *АБ СУПРАЦІЎЛЕНЬНІ ЗЬНІШЧЭНЬНЮ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ*

Заклікаем усіх беларусаў супраціўляцца вынішчэньню беларускіх арганізацыяў і ўстановаў, на якіх трымаецца жыцьцё і культура беларускай нацыі.

Тэхнічны плян аб ліквідацыі беларускай грамадзянскай супольнасьці, як вынікае з аналізу палітыкі і заяваў у Расеі, распрацаваны ў Маскве ў асяроддзі дарадцаў Пуціна. Пасьля незаконнага выбраньня на трэці тэрмін Лукашэнкі пачаўся з новай сілай працэс нацыянальнага разбурэньня Беларусі.

Зьнішчаюць знакавыя асяродкі беларускай культуры: Саюз пісьменьнікаў, літаратуру, бібліятэку і архіў пісьменьнікаў, рэдакцыю Беларускай Нацыянальнай Энцыкляпэдыі разам з архівам, арганізацыі аховы гісторыка-культурнай спадчыны, нішчаць беларускую моладзь, адмаўляючы ёй у вучобе і ўнівэрсітэцкай адукацыі.

Мы засяроджваем увагу ўсіх, што калі палітычна не супраціўляцца антыбеларускай акупацыйнай палітыцы рэжыму, то рэжым паступова задушыць усё беларускае і, пры ўмяшаньні Масквы ліквідуе беларускую дзяржаву.

Далучайцеся да палітычнай дзейнасьці Беларускага Адраджэньня. Стварайце групы падтрымкі Адраджэньня і паведамляйце пра гэта кіраўніцтву КХП-БНФ. Гэта ня будзе членствам у Партыі, але — народнай дапамогай нацыянальна-вызвольнаму змаганьню за вольную Беларусь.

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
*18 чэрвеня 2006 г. Менск*

## ЗАЦЕМКА

Часам цікава пачытаць ў Сеціве шчырасьці агентуры. Напрыклад:

„Для Козулина главное — перетерпеть. Он выйдет к концу 2007 — началу 2008 года, как раз в тот момент, когда власть Лукашенко начнет стремительно рушиться. Тогда он и возглавит при помощи, например, России, демократическую революцию. Но пока Козулин в тюрьме, лидер один — Милинкевич. Это технологически верно. Цели ясны, структура управления сформирована.” (П. Шарамет).

Думачкі з асяроддзя Глеба Паўлоўскага. Апошняя акцыя з выбарамі на Беларусі якраз і прайшла дакладна па тэхналёгіі крамлёўскай групы Паўлоўскага. Гэта працяг. Праўда, нічога новага. Задумкі даўно вядомыя.

***Т. Ракса***

## ПАМЯЦІ УЛАДЗІМЕРА ПЛЕШЧАНКІ

Няма больш Уладзімера Плешчанкі. 20 траўня ў вёсцы Вароны ён памёр на двары перад бацькаўскай хатай ад сардэчнага прыступу на 57 годзе жыцьця. Сябра Сойму Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, кіраўнік Віцебскай арганізацыі КХП — БНФ. Цяжка ўявіць, што не жыве ўжо гэты моцны беларус, наш паплечнік і гераічны змагар.



***Уладзімер Плешчанка.***

З дня ў дзень Уладзімер Плешчанка прыходзіў да „Сіняга дому” ў цэнтры Віцебска са сьцягам, беларускай літаратурай, лёзунгамі і франтаўскімі ўлёткамі. Да яго ішлі параіцца, пагаварыць пра Беларусь, на яго кідаліся правакатары і непрыяцелі. Яго пастаянна цягнулі ў суд, саджалі за краты, прысуджалі непамерныя штрафы. Але пасьля суду ён зноў вяртаўся і ўсё пачынаў спачатку. Ён быў спакойны, пасьлядоўны і моцны, як крэмень, ён прымусіў сябе паважаць. Зь ім лічыліся нават ворагі.

Рэжым не прамінаў выпадку, каб яго асудзіць, аштрафаваць ды бясправўна пасадзіць за краты. Аднойчы па падазрэньні (якога не даказалі) яго пратрымалі паўгода ў турме. На яго наклалі шматмільённыя штрафы за беларускае слова, за Беларускі Сьцяг, за раздачу беларускіх газэтаў, за дэманстрацыю нязгоды з прамаскоўскім рэжымам, за шанаваньне Беларусі. Ён ня мог і не зьбіраўся плаціць ім іх халуйскія штрафы за сваю беларускую пазыцыю, бо ня меў маёмасьці, а яны ганебна вешалі на яго штрафныя мільёны, думаючы запалохаць.


(Фота: радыё „Свабода")

*Апошні шлях.*

Уладзімер Плешчанка паказаў несамавіта яркі ўзор ахвярнага служэньня вольнай Беларусі і сваісты прыклад змаганьня за гонар і свабоду Бацькаўшчыны. На такія паводзіны здольныя толькі людзі моцныя духам.

Імя Уладзімера Плешчанкі вялікімі літарамі ўпісана ў беларускую барацьбу за ідэалы незалежнасьці і свабоды. Перамога будзе. Бывай наш дарагі сябра!

***Зянон Пазьняк***

*21 траўня 2006 г.*

## УЛАДЗІМЕР РЫГОРАВІЧ ПЛЕШЧАНКА (26.07.1948 — 20. 05. 2006)

Ён жыў дзеля Беларусі. Дарагой Айчыне, нашаму народу былі прысьвечаны кожнае імгненьне ягонага яркага і гераічнага жыцьця, ягоныя думкі, мары і стваральныя справы. Ён быў з кагорты рыцараў беларускага нацыянальнага Адраджэньня, якія ва ўсе часы нашай гісторыі баранілі Беларусь, былі прыкладам мужнасьці і самаахвярнасьці для цэлых пакаленьняў і назаўсёды засталіся з намі як увасабленьне нашага нацыянальнага духа. За сваю працу на ніве Адраджэньня, за свой змагарны подзьвіг ён ніколі не прасіў узнагароды альбо прызнаньня заслугаў. Дзякуючы такім змагарам жыве незалежная Беларусь, не здаецца наш народ падступнаму імпэрскаму ворагу. Уладзімер Плешчанка бараніў Айчыну разам з сябрамі-аднадумцамі пад сьвятым Бел-Чырвона-Белым Сьцягам. Ён заўсёды казаў людзям праўду, нават тады, калі было выгадна жыць не па праўдзе, прыстасавацца і не рызыкаваць. Калі ўвосень 1988 года паўстаў Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне", Уладзімер Плешчанка стаў адным з выдатных дзеячаў нацыянальна-вызвольнага руху. Ён узначаліў і на працягу шэрагу гадоў кіраваў Віцебскай гарадзкой арганізацыяй Народнага Фронту, а потым і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. Антыбеларускі рэжым баяўся патрыёта, імкнуўся зламаць яго паліцэйскімі, судовымі і турэмнымі рэпрэсіямі. Псэўдаапазіцыя блюзьнерыла ў адрас патрыёта, псэўдадэмакратычны друк замоўчваў ягонае імя і мужныя справы. Але рэпрэсіі не запалохалі яго, ён не зважаў на фальшывых псэўдаапазіцыйных імітатараў. Ён верыў у наш народ, у ягоную змагарную моц і заклікаў да Беларускай Салідарнасьці. Беларусы адказалі яму даверам і павагай. Дзякуючы яму тысячы людзей паверылі ў адраджэнскую справу і ў беларускую перамогу, далучыліся да змаганьня. Сябра Сойму Народнага Фронту і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ Уладзімер Плешчанка браў чынны ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі партыйных праграмаў і мерапрыемстваў. Ягоны жыцьцёвы досьвед, высокая культура і інтэлект, прынцыповасьць пазіцыяў і шчырасьць душы заўсёды дапамагалі нам прыняць слушнае рашэньне, знайсьці адказ на самыя складаныя пытаньні. Але віцеблянам ён запомніцца перш за ўсё як нязломны змагар на перадавой лініі абароны Беларусі. Не баючыся ўдараў антыбеларускай дыктатуры, ён на працягу гадоў з дня ў дзень выходзіў у цэнтар гораду, каб сустрэцца з людзьмі і зноў казаць ім праўду, зноў заклікаць іх да салідарнага супраціву расейскай імпэрыі і яе мясцовым паслугачам. Лепшай узнагародай яму стаў сёлетні вясновы рэвалюцыйны ўздым беларускай моладзі, якая прыняла ад старэйшых паходню змаганьня за Беларусь. Мы выказваем шчырыя спачуваньні ягонай сям'і. Памяць аб Уладзімеры Плешчанку застанецца з намі назаўжды. Ягонае жыцьцё і подзьвіг увасобяцца ў вольнай і незалежнай Беларусі.

***Сябры Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***
***і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

*20 траўня 2006 г.*

## НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ПАХАВАЛІ УЛАДЗІМЕРА ПЛЕШЧАНКУ

У вёсцы Вароны 22 — га траўня адбылося пахаваньне. Людзі разьвітваліся з адным са старэйшых фронтаўцаў Віцебшчыны Ўладзімерам Плешчанкам. Да ліку старэйшых змагароў за вольную Беларусь спадара Плешчанку ў Віцебску адносілі не з прычыны сталага ўзросту — раптоўная сьмерць спасьцігла яго ўсяго толькі на 58-м годзе жыцьця.

Побач зь ім амаль заўсёды бываў і Барыс Хамайда, які цяпер згадвае пра свайго сябра і паплечніка: (Хамайда: ) „Я магу сказаць, што Плешчанка жыў дзеля Беларусі. Усё паклаў, і сваё здароўе, і жыцьцё — апошнія 16 год дык дакладна. Столькі было ўціску на яго: і штрафы, і суды, і пакараньні, і турэмныя камэры. І вось сэрца ня вытрымала. Першы інфаркт у яго быў у 1992-м годзе, а другі — у 1994-м, калі мы шмат працавалі, калі агітавалі за Зянона Пазьняка. Урэшце сэрца ня вытрымала!" На пахаваньне старшыні Віцебскай абласной рады Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ Уладзімера Плешчанкі сабраліся дзясяткі людзей з усяе Беларусі — ад партыйнага кіраўніцтва КХП БНФ зь Менску да аднадумцаў з Воршы, Полацку, Сянна. Вянкі ды кветкі да труны змагара прынесьлі мясцовыя прадстаўнікі ўсіх апазыцыйных палітычных партыяў.

***(Радыё Свабода, 22.05.2006.)***

## КАТАЛЁНЦЫ НА ШЛЯХУ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

18 чэрвеня нацыяналісты перамаглі на рэфэрэндуме ў Каталёніі. 73,9% удзельнікаў рэфэрэндуму выказаліся за пашырэньне аўтаноміі рэгіёну. Цяпер паводле Канстытуцыі Каталёніі каталёнская мова зьяўляецца дзяржаўнай і абавязкавай у публічнай сфэры. Каталёнцы цалкам кантралююць свой бюджэт, парты, прадпрыемствы. Ва ўсім сьвеце (а таксама ў Мадрыдзе) перамога каталёнцаў успрынята як вялікі крок да аднаўленьня незалежнасьці Каталёніі. Наступныя на гэтым шляху — змагарныя баскі.

***Янка Базыль***

# ЛЮДЗІ БЯЗ ГОНАРУ

Культурны чалавек, які паважае сябе і дбае пра добрае сваё імя, не гаворыць няпраўду. Хлусьлівасьць — прыкмета плебейства. Нізкі чалавек ніколі ня будзе раскайвацца ў хлусьні ці прасіць прабачэньня, калі схлусіў незнарок, бо ня лічыць няпраўду заганай.

6-га красавіка газзта „Народная Воля" надрукавала пра мяне заведама ілжывы матэрыял пад псэўданімам нейкага (ці „нейкай") Алег Сноў.*

Гэты непраўдзівы матэрыял быў падрыхтаваны раней журналістам зь Белапан і зьмешчаны ў Сеціве. Але на другі ж дзень (30-га сакавіка) пасьля высьвятленьня што інфармацыя непраўдзівая, Белапан зьмясьціла абвяржэньне і прынесла прабачэньні. Рэдактар „Народнай Волі" ня мог гэтага ня ведаць і ня чытаць. Тым ня менш ён як ні ў чым ні бывала друкуе фальшыўку.

Можна, аднак, дапусьціць што рэдактар у нечым памыліўся. І таму на імя сп. Сярэдзіча мной быў напісаны кароткі ліст з дадаткам абвяржэньня ад Белапан.

Мінуў месяц. „Ні атвета ні прывета". І гэтыя людцы яшчэ нешта спрабуюць пісаць пра культуру, Эўропу, цывілізаванасьць, крытыкуюць хамства рэжыму, хоць самы ні на крок не адышлі ад ягоных хамаватых звычак і саўковых паводзінаў.

Шчыра кажучы, я не чакаў, што яны са мной гэтак сябе паставяць. Аказваецца можна. Хаця тут справа не ў палітыцы, не ў пазыцыях, а ў элемэнтарнай прыстойнасьці. Але, відаць, Бог ня даў. Людзі бяз гонару. Куды там у Эўропу з такім багажом, спадары! У Эўропе і ў Амэрыцы на кожным кроку дзякуюць, усьміхаюцца і просяць прабачэньня.

*Зянон ПАЗЬНЯК*

**Д а д а т а к 1:**

30/03/2006 10:40

**З.ПОЗНЯК ОПРОВЕРГАЕТ ИНФОРМАЦИЮ О ТОМ, ЧТО ТРЕБУЕТ ГАРАНТИИ ОТ В.ПУТИНА И А.ЛУКАШЕНКО**

Минск, 30 марта. Председатель Консервативно-Христианской партии — БНФ (КХП-БНФ) Зенон Позняк опровергает информацию о том, что он связывает свое возвращение в Беларусь с гарантиями личной безопасности от Владимира Путина и Александра Лукашенко.

Несколько дней назад представители белорусской интеллигенции обратились к З.Позняку, который находится в эмиграции с весны 1996 года, с предложением вернуться на родину. Напомним, З.Позняк участвовал в нынешней президентской кампании. Его инициативная группа собирала подписи за выдвижение лидера КХП-БНФ кандидатом в президенты Беларуси.

29 марта в интервью БелаПАН З.Позняк назвал „бессмысленными" все обращенные к нему призывы о возвращении в Беларусь, „так как то, что понимают сознательные белорусы, по-своему понимают Лубянка и Лукашенко". „Так что по этому вопросу надо обращаться не ко мне, а к руководству России и Беларуси", — подчеркнул З.Позняк.

Корреспондент БелаПАН ошибочно трактовал эти слова как апелляцию к гарантиям личной безопасности от В.Путина и А.Лукашенко.

БелаПАН приносит свои извинения З.Позняку.

**Д а д а т а к 2 :** (Вытрымка зь ліста у адказ)

From: Алесь Липай <lipay@belapan.com>
Date: Mar 30, 2006 10:00 AM
Subject: Ad A. Lipaya

Паважаны Зянон Станіслававіч! Прыміце мае асабістыя і ад усяго БелаПАНу прабачэньні з нагоды заметкі Марата Гаравога, якая была распаўсюджаная па каналах нашай інфармацыйнай агенцыі.Пасьля размовы з Гаравым мне падалося, што памылка зробленая ім не наўмысна, а з прычыны непрафесійнасьці, з-за таго, што ён узяў на сябе сьмеласьць тлумачыць выказваньні суразмоўцы і рабіць уласныя высновы. Ва ўсялякім разе, яму заяўлена пра недапушчальнасьць такога падыходу. Абвяржэньне заметкі Гаравога ўжо выстаўленае ў нашую інфармацыйную ленту, а таксама ў рубрыку „Выбары" інтэрнэт-газеты www.naviny.by ..........

З павагай, Алесь Ліпай, БелаПАН

* Цяпер высьветлена, што пад гэтым псэўданімам хаваецца асоба з прамаскоўскай агентуры

# ВАЛЕРЫ МАРАКОЎ

***(Менск 27.3.1909, в. Акалонія (цяпер у межах Менску) – 29.10.1937, Менск)***

„Валеры Маракоў быў адным з самых таленавітых паэтаў 1920 – 30-х гадоў. Моладзь любіла ягоную паэзію. Дзіўна, але яе чамусьці вабіў той пэсымізм, разгубленасьць. Мабыць, настрой паэзіі Маракова адпавядаў настроям чытачоў? Гэта была паэзія каханьня, надзей і расчараваньняў, адыходу ад грамадзкага афіцыёзу ў сьвет хараства, у сьвет чалавечнасьці". Такая характарыстыка належыць пяру сучаснага беларускага літаратуразнаўцы зь Нью-Ёрку Лявона Юрэвіча. Ня менш высока творчасьць Маракова ацэньвалі ягоныя блізкія знаёмыя й калегі. Паэт Станіслаў Шушкевіч апавядаў, як цешыўся першымі паэтычнымі крокамі Маракова Янка Купала. Сяргей Грахоўскі прыгадваў, што першы зборнік Валерыя „Пялёсткі" пераходзіў з рук у рукі і перапісваўся „ў патаемныя дзявочыя зборнікі".

Але ад канца дваццатых гадоў у друку ўсё часьцей гучалі іншыя водгукі й ацэнкі – „безнадзейны пэсымізм", „блуканьне ў нетрах упадніцтва", „стаяньне ўбаку ад сацыялістычнага будаўніцтва". Заставаўся адзін крок да палітычных абвінавачваньняў.

Паэт спрабаваў схавацца ад "аглабельшчыны" ў асяродзьдзі тагачаснай менскай літаратурнай багемы, якая стварыла славуты ТАВІЗ, або, як расшыфроўвалася гэтая абрэвіятура – "Таварыства аматараў выпіць і закусіць". Валеры намагаўся рыфмаваць нешта патрэбнае ўладзе пра камісараў, Асінбуд і запалкавую фабрыку, але празь дзяжурныя радкі прабівалася прадчуваньне блізкае трагедыі – і агульнанацыянальнай, і асабістай:

*Шчасьлівы я, што тут жыву.*
*Й за гэты край вясной вялікай,*
*Быць можа, зьнімуць галаву,*
*Праколюць цела во́страй пікай...*

У 1935-м Маракова за публікацыю верша "Песьня перамог" на паўгоду выключаюць з Саюзу пісьменьнікаў. Тады сама адбываецца першы арышт – за ўдзел у "контаррэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі". Варанок прыязджае і па ягонага бацьку Дзьмітрыя, царкоўнага старасту, якога засудзілі на 10 гадоў. Праз год паэта зноў арыштоўваюць...

Пасьля году катаваньняў яго разам зь яшчэ 21 літаратарам расстралялі ў менскай турме на досьвітку 29 кастрычніка 1937-га. Разгляд кожнай справы ў судзе замаў роўна 15 хвілінаў. У прыгарадным лесе, які пазьней стаў паркам Чалюскінцаў, зьявілася новая безыменная братняя магіла.

Бацьку паэта, Дзьмітрыя Захаравіча, пасьля вяртаньня з ГУЛагу гэбісты бясконца – нават у 80 гадоў – цягалі на допыты. Трагічны лёс напаткаў і малодшых братоў Валерыя Маракова – Леаніда і Уладзімера, якія таксама сьвядома служылі Беларусі. Першага ў 1943-м расстралялі баевікі Арміі краёвай, другі ў 1956-м вярнуўся з савецкага канцлягеру псыхічна хворым.

Сёньня ў Беларусі добра ведаюць пляменьніка паэта – пісьменьніка й дасьледніка Леаніда Маракова, які шмат зрабіў для вяртаньня творчай спадчыны свайго дзядзькі і зьдзейсьніў сапраўдны подзьвіг, выдаўшы энцыкляпэдычны даведнік у чатырох кнігах, прысьвечаны рэпрэсіям у Беларусі за два апошнія стагодзьдзі.

***Уладзімер Арлоў***

# РАСЕЙЦЫ КАЖУЦЬ, ШТО ІМ ЗАМІНАЕ ЎСХОДНЯЯ ЭЎРОПА

24 траўня 2006 г. Аўстрыйская газэта „Die Presse" піша пра прэтэнзіі РФ, што, маўляў, новыя ўсходнеэўрапейскія краіны Эўразьвязу абцяжарваюць адносіны паміж Масквой і Эўразьвязам, бо „яны канцэнтруюцца на траўмах мінуўшчыны". Амбасадар Расеі ў Эўразьвязе Уладзімір Чыжоў

заявіў у Брусэлі пра былыя падсавецкія краіны: „Яны прынесьлі з сабой у Эўразьвяз іхны фантомны боль. Гэта замінае стратэгічнаму партнёрству. Польшча, балтыйскія краіны маюць вельмі напружаныя адносіны з Расеяй”. Газэта заўважае, што згаданыя краіны імкнуцца вызваліцца ад энэргетычнай залежнасьці ад Расеі.

**Наш камэнтар:** Вось як, аказваецца: „фантомны боль”. Гэта значыць, што вызваленыя народы прыдумалі сабе боль і траўмы расейскай акупацыі, прыдумалі сотні тысячаў забітых і скалечаных расейскімі эсэсаўцамі і гестапаўцамі суайчыньнікаў, прыдумалі канцлягеры ГУЛАГу, шалёную русіфікацыю і зьнішчэньне нацыянальных культураў і моваў, панаваньне звыродлівых асаднікаў і жорсткую эксплуатацыю натуральных і чалавечых рэсурсаў сваіх краінаў. Паводле лубянска-крамлёўскага амбасадара, яны павінны былі б маўчаць пра гэта ў Эўразьвязе і дапамагаць Расеі наладжваць эўрапейскае партнёрства (гэта значыць, прыслугоўваць Маскве, як у былыя часы). Трэба зразумець, што такія маналёгі мы будзем чуць ад расейскай дыпляматыі, пакуль будзе існаваць іхная імпэрыя. Успомнім, што для вызваленых краінаў і ўсяго сьвету Нямеччына стала нармальным і раўнапраўным партнёрам толькі пасьля таго, як там агульнымі намаганьнямі дэмакратычных дзяржаваў (у тым ліку акупацыяй яе тэрыторыі на працягу гадоў) была зьліквідавана фашыстоўская дзяржаўная машына, пакараны злачынцы, забаронены фашыстоўская ідэалёгія і фашыстоўскія арганізацыі. Так што нармальнасьць партнёрства магчымая толькі пасьля краху расейскага гэбоўскага імпэрыялізму.

***Валеры Буйвал***


(Фота:Анатоль Андроў)

***Беларускія пільгрымы на сустрэчы з Папам Бэнэдыктам XVI у Польшчы.***

## АГЕНТУРА

**ЧУДЗІН** (***псэўданім „Юры Васілеўскі”***)

„Чудин Юрий Робертович, русский, 1965 г.р., уроженец г. Ульяновска РСФСР, закончил экфак МГУ (Москва). Служил в во внутренних войсках МВД. Завербован КГБ.

Изучил белорусский язык, писал статьи по-белорусски на краеведческие темы, в основном по белорусам смоленского и брянского регионов. В начале 1990-х годов направлен в Минск с заданием внедриться в неформальные структуры белорусского общества.

По заданию спецслужб под видом „белорусского активиста-униата” работал непродолжительное время в Польше, а затем в белорусской редакции „Радио Ватикан”.

Был женат на дочери белорусского поэта и переводчика В. Семухи. Благодаря этому браку смог приехать в США и начать деятельность по разложению общественных и религиозных организаций белорусской диаспоры. Войдя в доверие, совершил хищения значительных денежных сумм под предлогом авансов для написания работ по истории эмиграции и БАПЦ.

По рекомендации Ю.Р. Чудина структуры БАПЦ согласились на сотрудничество с Игорем Якуниным („отец Игорь”) и Виктором Костюком („епископ Василий”), однокашниками по Минской Духовной Семинарии, которые прибыли в США для того, чтобы возглавить БАПЦ и впоследствии перевести ее под юрисдикцию РПЦ.

В настоящее время Ю.Р. Чудин возглавляет резидентуру спецслужб РБ и РФ среди граждан США белорусского происхождения, приехавших в 1990-е — нач. 2000 - х годов. Издает газету „Час”, которая публикуется на русском и частично на белорусском языках.

Характер неуравновешенный, склонен к интригам, тщеславен, алчен. Проявляет повышенный интерес к сбору информации на окружающих его людей, которая может каким-либо образом их скомпрометировать или представить в невыгодном свете.”

***Матэрыял з Інтэрнэту (tut.by)***

## „АЛЕ Ж АБСУРД!”

19 траўня паводле алфавітнага парадку Расея стала старшынём Камісіі рады міністраў Эўропы, фактычна кіраўніком Рады Эўропы ў Стразбурзе. Павесялеўшы міністар замежных сувязяў РФ Лаўроў загаварыў пра „рэформы гэтай міжнароднай арганізацыі, неабходнасьць дэпалітызаваць Стразбузкі суд па правах чалавека”. Няхай заходнікі будуць упэўненыя: лубянцы рэформамі ў Стразбурзе зоймуцца шчыльна.

Але ж абсурд! Гэбоўская імпэрыя, якая кіруе міжнародным тэрарызмам па ўсім сьвеце, якая ў адкрытую заціскае нафтава-газавай удаўкай Эўропу, будзе цяпер старшыняваць у агульнаэўрапейскай структуры. Нагадаем, што нават у 1930-я гады (славутыя згодніцтвам з фашызмам і камунізмам) Ліга Нацыяў казала выйсьці зь яе складу краінам-агрэсарам (СССР, Нямеччыне, Японіі). А цяпер проста з канцлягеру Чарнакозава (што ў акупаванай Чачэніі) прыедзе ў Стразбург які-небудзь прафэсійны растрэльшчык і будзе „дэпалітызаваць” суд па правах чалавека.

***Янка Базыль***

**З Ь М Е С Т**


1. Зянон Пазьняк. „Заўтра ў вольнай Беларусі” . . . . . . . . . . 2
2. Тамаш Ракса. Беларусы павінны рыхтавацца да вайны з Расеяй. Масква пляную анэксію . . . . . . . . . . 6
3. Тамаш Ракса. Выказваньне агента . . . . . . . . . . 6
4. VII Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і IX Зьезд Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”. . . . . . . . . . 6
5. Абараніць незалежнасьць Бацькаўшчыны. . . . . . . . . . 7
6. Пастановы . . . . . . . . . . 7
7. Галіна Пазьняк. Рэгістрацыя Фронту . . . . . . . . . . 8
8. Зянон. Выбраныя вершы . . . . . . . . . . 8
9. Травеньскі Сойм . . . . . . . . . . 11
10. Гераічная беларуска . . . . . . . . . . 12
11. Мар’ян Ванькевіч. Супраць каго санкцыі? . . . . . . . . . . 12
12. Дакументы чэрвеньскага Сойму Партыі БНФ. . . . . . . . . . 12
13. Т. Ракса. Зацемка. . . . . . . . . . . 13
14. Зянон Пазьняк. Памяці Ўладзімера Плешчанкі. . . . . . . . . . . 13
15. Уладзімер Рыгоравіч Плешчанка . . . . . . . . . . 14
16. На Віцебшчыне пахавалі Ўладзімера Плешчанку. . . . . . . . . . . 14
17. Янка Базыль. Каталёнцы на шляху да незалежнасьці. . . . . . . . . . . 14
18. Зянон Пазьняк. Людзі бяз гонару . . . . . . . . . . 15
19. Уладзімер Арлоў. Валеры Маракоў. . . . . . . . . . . 15
20. Валеры Буйвал. Расейцы кажуць, што ім замінае . . . . . . . . . . 15
21. Агентура . . . . . . . . . . 16
22. Янка Базыль. „Але ж абсурд!”. . . . . . . . . . . 16



*Нумар аддрукаваны пры падтрымцы беларускай фундацыі імя Рамуальда Траўгута.*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**